

ВІТАМІНЫ АД ДЗЕДА МАРОЗА

5

ЯК СЕНАТАРЫ ДАПАМАГАЮЦЬ ЛЮДЗЯМ

МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 СТУДЗЕНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 5 (29885)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

## КОРАТКА

- У Беларусі завяршыліся мерапрыемствы па зверцы ўліковых звестак ваеннаабавязаных.
- **Пляцоўка па рэалізацыі прадукцыі лясгасаў пачала працаваць у Гомелі.**
- «Зімовы ўніверсітэт» стартуе 16 студзеня ў БДУ.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ХЛАБУКІН, дэпутат Палаты прадстаўнікоў:**

*«Год міру і стварэння будзе садзейнічаць міжканфесіянальнаму дыялогу, забяспечваць мір і згоду ў беларускім грамадстве, умацоўваць Саюзную дзяржаву, ЕАЭС і АДКБ, працягне дэманстраваць устойлівасць і перавагі беларускай эканамічнай мадэлі ва ўмовах глабальнай сусветнай фінансава-эканамічнай вайны, нестабільнасці і санкцыйнага ціску, ставячы на першае месца стваральную, сумленную, добрасумленную працу кожнага беларуса, працу як галоўную ўмову павышэння ўстойлівасці і развіцця суверэннай і незалежнай беларускай дзяржавы. За мінулыя гады мы ўмацавалі народнае адзінства, згуртаваўшыся ўсе максімальна — ад рабочага да міністра, кожны на сваім працоўным месцы, выконваючы службовыя абавязкі. Нездарма ж гаворыцца: мы моцныя, калі разам. І мы ні на хвіліну не аддадзім і ніколі не падвядзём сваю краіну. Час выбраў нас, і ён заўсёды будзе патрабаваць ад нас актыўных дзеянняў — у імя міру і стварэння».*

ISSN 1990 — 763X
23005
9 771990 763008

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «АД ТАГО, ЯК МЫ БЕРАЖОМ ЧЫСЦІНЮ РОДНАЙ МОВЫ, ЯКІЯ СВЯТЫ І СІМВАЛЫ ЎПУСКАЕМ У СВОЙ ДОМ, ЗАЛЕЖЫЦЬ БУДУЧЫНЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

### Прэзідэнт уручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльныя прэміі «Беларускі спартыўны Алімп»

**Адпаведныя ўказы кіраўнік дзяржавы падпісаў 30 снежня. За актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, якая садзейнічае захаванню і прымнажэнню нацыянальнага культурнага набытку, выхаванню ў моладзі любові да Айчыны, умацаванню духоўных каштоўнасцяў і ідэй міласэрнасці, па выніках 2022 года прысуджана чатыры прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». За выдатныя дасягненні ў сферы музычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, музейнай справы, народнай і аматарскай мастацкай творчасці, навучання і выхавання творчай моладзі, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысуджана 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва. За актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць фарміраванню гарманічнай асобы, спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» па выніках 2022 года прысуджана Антону Смольскаму, Анастасіі Пракапенцы і Віктару Байкову.**



Фота БелТА.

**Прэзідэнт уручае спецпрэмію «Беларускі спартыўны Алімп» заслужанаму майстру спорту Рэспублікі Беларусь Анастасіі ПРАКАПЕНКА.**

### «ДЗЕ ЗГОДА І ПАВАГА — ТАМ І МІР»

Пачынаючы цырымонію ўзнагароджання лаўрэатаў прэмій, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што гэты вечар з'яўляецца працягам самага светлага, самага сямейнага і прыгожага свята Раства.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што прэміі, якія штогод уручаюцца гэтымі зімовымі днямі, — даніна спрадвечным традыцыям, што звязваюць эпохі і пакаленні, даніна духоўнай сіле беларусаў — мудрых, працавітых, якія любяць родную зямлю і шануюць продкаў.

СТАР. 2




# ЭКСТРЫМ ДА ПАЛОНКІ ДАВЯДЗЕ

### Пра што неабходна падумаць, перш чым выходзіць на лёд?

**Няўстойлівае надвор'е, якое суправаджаецца то моцнымі маразамі, то вясновай адлігай, натуральна, уплывае і на таўшчыню лёду на вадаёмах. Аднак аматары зімовай рыбалкі, а таксама іншыя экстрэмалы, якія шукаюць іншых забаў на неакрэплым ледзяным покрыве, не звяртаюць увагу на прагноз сіноптыкаў і быццам не адчуваюць плюсавай тэмпературы... А потым, калі ўжо праваліліся пад лёд, з усіх сіл, што ў іх яшчэ засталіся, просяць навакольных і ратавальнікаў аб дапамозе, вінавацячы сябе ў неабачлівасці і, прабачце, дурасці.**

### ГІСТОРЫІ СА ШЧАСЛІВЫМ КАНЦОМ І НЕ ВЕЛЬМІ...

Першыя ахвяры неакрэплага лёду ў гэтым сезоне былі зафіксаваны вельмі рана. Не паспеў выпасці першы снег і толькі пачало падмарожваць (а было гэта, нагадаю, яшчэ ў лістападзе), як рыбакі, відаць, моцна захацелі ўлову або не хапала ім адрэналіну. Бо як яшчэ растлумачыць прычыну таго, што трое дарослых мужчын накіраваліся на вадаём каля аграгарадка Дворышча ў Дзяржынскім раёне, які ледзь-ледзь пакрыўся лёдам?! На працягу двух дзён ратавальнікі шукалі аматараў рыбнай лоўлі пад вадой. Знайшлі. Дапамагчы, зразумела, нікому з іх ужо было нельга...

СТАР. 3

Бумеранг дабрыні

# Як Цяпа і Каця сталі зоркамі інтэрнэту

### Людзі, якія ратавалі жывёл, натхнілі на такую справу іншых

**Сёння раскажу вам дзве цёплыя гісторыі. Аб'ядноўвае іх тое, што яны пра людзей з вялікай душой, якія вераць, што дабрыня і любоў выратуюць свет. Адна з гераінь — Ганна Крылова з Мінска — прытуліла кацяня з прыроджаным парушэннем каардынацыі руху, другая — Надзея Літвінюк з Валожыншчыны падарыла шчаслівую старасць кабыле Каці.**



**Ганна і яе чароўны кот Цяпа.**

# «АД ТАГО, ЯК МЫ БЕРАЖОМ ЧЫСЦІНЮ РОДНАЙ МОВЫ, ЯКІЯ СВЯТЫ І СІМВАЛЫ ЎПУСКАЕМ У СВОЙ ДОМ, ЗАЛЕЖЫЦЬ БУДУЧЫНЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Больш за чвэрць стагоддзя таму мы ўшаноўвалі першых лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне», — нагадаў беларускі лідар. — Тады мы нават падумаць не маглі, з якімі выклікамі сутыкнёмся ў барацьбе за сваю духоўнасць, за сваю гістарычную спадчыну і за свой лад. І не ўяўлялі, наколькі актуальная будзе традыцыя ўзнагароджваць людзей, што прысвяцілі сябе высакароднай справе — захаванню нашых духоўных вытокаў».

Але, па словах кіраўніка дзяржавы, мы заўсёды ведалі, а сення асабліва востра ўсведамляем, што ўсе створаныя беларускім народам матэрыяльныя і нематэрыяльныя каштоўнасці — гэта і ёсць тыя скрэпы, на якіх зараджаўся і развіваўся нацыянальная дзяржаўнасць. «Яны — у працах першых асветнікаў беларускай зямлі, у пабудаваных нашымі дойлідамі храмах, палацах і музеях, у шэдэўрах музыкі, жывапісу, паэзіі і прозы, створаных нашымі таленавітымі суайчыннікамі, — адзначыў Прэзідэнт. — Яны — у подзвігах народа-пераможца, які падарыў нам мір, незалежнасць, само права жыць. Народа-працаўніка, які адрадзіў апаленую агнём вайны родную зямлю. Мы бачым іх у праваслаўі, якое больш за тысячу гадоў таму аб'ядала славян у старажытную дзяржаву, навучыла міласэрнасці, міралюбнасці і любові да бліжняга».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, сёння мы разумеем, што нацыянальныя культуры і традыцыі нельга падагнаць пад адзіны стандарт, што свет цудоўны ў сваёй разнастайнасці. «І не проста разумеем, а пацвярджаем гісторыяй сваёй дзяржавы, дзе больш за сотню гадоў людзі розных веравызнанняў і этнічнага паходжання жывуць у згодзе, робячы нас усіх духоўна багацейшымі, — перакананы кіраўнік дзяржавы. — А дзе згода і павага — там і мір».

«Мы таксама разумеем, што наш прыклад — гэта рэальны выклік праекту глабальнай уніфікацыі пад ультрамодныя каштоўнасці і так званыя трэнды, навязаныя ўсяму свету, — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Разумеем, што за гэтай культурнай экспансіяй — як яе яшчэ называюць, «мяккай» — ідуць зусім не мяккія, я нават сказаў бы, вельмі жорсткія для незалежных дзяржаў наступствы: страта дзяржаўнасці і суверэнітэту, страта сябе як народа».



Фота БелТА.

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі ВЕНІЯМІН, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, і генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ.

Таму, па словах беларускага лідара, трэба памятаць, што ад таго, як мы беражом чысціню роднай мовы, якія святы і сімвалы ўпускаем у свой дом, залежыць будучыня нашых дзяцей. «Калі жадаем, каб яны жылі на сваёй зямлі свабодна і незалежна, як мы, то павінны ў першую чаргу навучыць адрозніваць родныя традыцыі ад чужародных, — перакананы ён. — Таму штогадовая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў прэмій года перш за ўсё — знак прызнання ўсіх, хто працуе на гуманітарнай і культурнай ніве, хто захоўвае нашы духоўныя вытокі. Без парабольшання ў пытаннях гарантавання нацыянальнай бяспекі Беларусі ваша роля таксама з'яўляецца вядучай».

## «ВАШЫ ТВОРЧЫЯ ДАСЯГНЕННІ — ГЭТА ЖЫВАТВОРНАЯ КРЫНІЦА»

Да лаўрэатаў прэмій кіраўнік дзяржавы звярнуўся на беларускай мове. «Вашы творчыя дасягненні — гэта жыватворная крыніца, якая напаўняе скарбніцу нацыянальнай культуры, — акцэнтаваў увагу Аляксандр Лукашэнка. — Я добра ведаю: усё, што вы робіце, — не дзеля ўзнагарод ці матэрыяльнага прыбытку. Ваш прафесійны, жыццёвы шлях абраны вашым сэрцам. А таму вы, як ніхто іншы, вартыя высокага прызнання і глыбокай павагі людзей. Савмі духоўнымі, творчымі і прафесійнымі дасягненнямі вы ствараеце будучыню нашай Беларусі. Шчыра ганаруся вамі і ад усёй душы ўдзячны за вашу працу».

Кажучы пра лаўрэатаў, Прэзідэнт назваў іх апантанымі сваёй справай людзьмі, якія ўласным прыкладам усталёўваюць ідэалы міласэрнасці і дабрыні ў сучасным грамадстве, выхоўваюць патрыётамі падрастаючае пакаленне, перадаюць яму вялікую шчырую любоў да роднай зямлі. Па словах кіраўніка дзяржавы, рэалізуючы сацыяльна значныя культурныя і адукацыйныя праекты, яны дапамагаюць зберагчы гістарычную праўду і спрадвечную спадчыну нашага народа.

«Прэміяй «Беларускі спартыўны Алімп» адзначаюць тых, хто падняўся на вяршыню спартыўнага майстэрства, пацвердзіў свой найвышэйшы клас медалямі на найважнейшых спаборніцтвах, хто прысвяціў сваё жыццё выхаванню атлетаў і атрымлівае высокія вынікі сваёй працы, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Паважаныя лаўрэаты! Мне вельмі прыемна павіншаваць вас з такімі высокімі ўзнагародамі. Няхай гэтыя прэміі стануць не толькі яскравым вынікам мінулага года, але і стымулам для новых дасягненняў і перамог у імя росквіту любімай Беларусі. У гэты ўрачысты момант я жадаю вам міру, дабра, здароўя, новых поспехаў на карысць роднай краіны, творчых знаходак і спартыўных перамог у новым 2023 годзе».

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

## ЛАЎРЭАТЫ ПРЭМІІ «ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ» ПАДЗЯЛІЛІСЯ СВАІМІ ЎРАЖАННЯМІ І РАСКАЗАЛІ АБ ПЛАНАХ НА БУДУЧЫНЮ

За значны ўклад у выхаванне любові да Айчыны, даследаванні гісторыка-культурнай спадчыны, выпуск навуковага энцыклапедычнага выдання «Гарады і вёскі Беларусі» высокай узнагароды ўдастоены калектыў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук. Як расказаў **дырэктар цэнтра Аляксандр ЛАКОТКА,** 20-томнік гісторыі гарадоў і вёсак Беларусі ствараўся амаль 40 гадоў. Грунтоўнаму даследаванню папярэднічала шматгадовая праца ў экспедыцыях, якія праходзілі ў розных рэгіёнах Беларусі, а таксама скрупулёзная даследчая работа ў архівах, музеях розных гарадоў і нават краін. «У энцыклапедычным выданні прадстаўлена гісторыя многіх паселішчаў, а іх тут каля 24 тысяч, — заўважыў Аляксандр Лакотка. — Тут і геаграфія, і сацыяльна-гістарычная старонка любой вёскі ці сяла, тут і Героі Савецкага Саюза, і прадстаўнікі працоўнага гераізму, і мясцовыя знакамітасці, і вядомыя артысты, вучоныя, мастакі. Больш за шэсць тысяч артыкулаў прысвечана героям і ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, каля 16 тысяч — помнікам археалогіі, каля 1,5 тысячы — помнікам архітэктуры і палацава-паркавага мастацтва. Адноўлены гістарычныя звесткі па многіх вёсках і мястэчках, якія згадваюцца з XV—XVI стагоддзя, раскрываецца інфраструктура гэтых паселішчаў і дарог, якая існуе і сёння».

Высокай узнагароды ўдастоены і **аўтарскі калектыў у складзе Васіля БАРАНЧУКА, дырэктара Духоўна-асветніцкага цэнтра прыхода храма ў гонар прападобнамучаніцы вялікай княгіні Елісаветы ў Бабруйску, і настаяцеля парафіі гэтага храма протаіерэя Віктара ТОЛАХА** за вялікі ўклад ва ўмацаванне духоўных каштоўнасцяў, культурнае і маральнае выхаванне дзяцей і моладзі. «Гэта радасць і пачуццё высокай адказнасці, — менавіта так Віктар Толах вызначыў свае першыя эмоцыі пасля таго, як даведаўся аб прысуджэнні прэміі. — Любая ўзнагарода — як аванс. Ты атрымаў аванс — і павінен працаваць з яшчэ большай аддачай». Па словах святара, поспех любой краіны залежыць ад таго, як у ёй пастаўлена адукацыя. «Усю сваю ўвагу мы павінны ўдзяляць у першую чаргу сферы духоўнай адукацыі, бо разам з веданнем прадметаў маленькага чалавечка трэба навучыць любіць, радавацца, быць сапраўдным грамадзянінам», — перакананы ён.

Сярод лаўрэатаў прэміі — Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне ўдастоена гэтай узнагароды за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы, значны ўклад у аказанне дабрачыннай дапамогі і развіццё валанцёрскага руху. Як паведаміў **генеральны сакратар Беларускага Чырвонага Крыжа Дзмітрый ШАЎЦОЎ,** 101 год арганізацыя ішла да гэтай узнагароды. Кажучы пра валанцёрскі рух Беларускага Чырвонага Крыжа, генеральны сакратар заўважыў, што міграцыйны крызіс, які ў нас быў на беларуска-польскай і беларуска-ўкраінскай граніцах, паказаў, што ў Беларускага Чырвонага Крыжа не 16 тысяч валанцёраў, а значна больш: «Практычна ўся Беларусь з'яўлялася тады валанцёрам, кожны беларус аддаваў часцінку сябе: людзі прыносілі нам і прадукты, і адзенне, — згадаў тыя падзеі Дзмітрый Шаўцоў. — Мы адчувалі гэтую дапамогу, якая нас зараджала. Мы разумелі, што за намі — уся Беларусь».

За актыўную дзейнасць па ваенна-патрыятычным выхаванні падлеткаў прэміяй адзначаны заслугі ваенна-патрыятычнага клуба «Рысь» вайсковай часці 3214 унутраных войскаў МУС. Як падзяліўся **камандзір вайсковай часці 3214 Дзмітрый МІКША,** ваенна-патрыятычны клуб існуе крыху больш за год, але ўжо карыстаецца вялікай папулярнасцю ў хлопчыкаў і дзяўчат. «Хочацца выказаць падзяку Прэзідэнту Беларусі, Аляксандру Рыгоравічу, за высокую ацэнку, якая дадзена нашай карпатлівай рабоце па грамадзянскім і ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі, — заўважыў ён. — Час паказаў, што мы рухаемся ў правільным кірунку. І сёння толькі ва ўнутраных войсках створана 18 такіх клубаў. Яны ствараюцца і ва Узброеных Сілах, і ў пагранічных войсках. Гэта сведчыць аб тым, што тое патрэбна. Самае галоўнае для нас, што дзеці з жаданнем ідуць у гэты клуб. Мы іх не толькі выхоўваем — даём пэўныя веды. Самае галоўнае — мы разам з бацькамі вучым іх па-сапраўднаму любіць сваю Радзіму — Рэспубліку Беларусь. І гэта ў нас добра атрымліваецца».

# Узнагароды работнікам СМІ і культуры

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ і распараджэнне, у адпаведнасці з якімі работнікі СМІ і сферы культуры ўдастоены медалёў і Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

За плённую працу, высокі прафесіяналізм, значны асабісты ўклад у развіццё нацыянальнай журналістыкі і тэлебачання, выдатныя дасягненні ў сферы тэатральнага і музычнага мастацтва медаля Францыска Скарыны ўдастоены начальнік аддзела па асвятленні дзейнасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Беларускага тэлеграфнага агенцтва Уладзімір Мацвееў, загадчык аддзела навін культуры галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Міхаіл Равуцкі, саліст Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча Андрэй Коласаў, а таксама галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Ганна Маторная і саліст — вядучы майстар сцэны гэтага тэатра Дзмітрый Шабеця.

Васьмі работнікам СМІ аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта за значны асабісты ўклад у рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, высокі прафесіяналізм, аб'ектыўнае і ўсебаковае асвятленне падзей грамадска-палітычнага і сацыяльна-культурнага жыцця краіны.

Падзякі Прэзідэнта ўдастоены трое супрацоўнікаў галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі: загадчыца аддзела рэпарцёраў Настасся Бенедзісюк, намеснік загадчыка аддзела палітычных аглядальнікаў Ілона Красуцкая і загадчыца аддзела выпуску Ірына Якаўлева.

Акрамя таго, Падзякай Прэзідэнта адзначаны заслугі намесніка дырэктара дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Святланы Кнутавай і дырэктара дырэкцыі ранішняга вяшчання гэтага тэлеканала Таццяны Рудакоўскай, начальніка аддзела падтрымкі і развіцця інтэрнэт-рэсурсаў Беларускага тэлеграфнага агенцтва Наталлі Яроміч, начальніка аддзела па радыёвяшчанні «Альфа Радыё» Выдавецкага дома «Беларусь сёння» Вадзіма Шэпета, загадчыка аддзела дызайну камп'ютарнай графікі дырэкцыі тэлевытворчасці ЗАТ «Сталічнае тэлебачанне» Дзмітрыя Галоўчыка.

# ЭКСТРЫМ ДА ПАЛОНКІ ДАВЯДЗЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, пачынаючы з лістапада, на вадаёмах па ўсёй краіне патанула каля 20 чалавек. Сярод ахвяр, на жаль, ёсць і дзіця. Трагічны выпадак з гібеллю непаўналетняга здарыўся ў Мінску акурат напярэдадні святкавання Новага года. 31 снежня двое падлеткаў праваліліся пад лёд на Сляпянскай воднай сістэме. За дзесяць метраў ад берага ратавальнікі пры дапамозе супрацоўнікаў патрульна-паставой службы РУУС выцягнулі з палонкі аднаго з хлопцаў, які абышоўся толькі пераахаладжэннем і моцным спалохам. Другога падлетка дасталі з вады без прытомнасці. Медыкі вярнулі яго да жыцця. Дзяцей шпіталізавалі. Як потым стала вядома, аднаго з іх, 17-гадовага хлопца, выратаваць не ўдалося...

Такі ж лёс напаткаў і аднаго з рыбакоў, якія 3 студзеня лавілі рыбу на Дуброўскім вадасховішчы ў Смалявіцкім раёне. Мужчыны займаліся любімай справай, як нечакана трэснуў лёд — абодва апынуліся ў вадзе. Да прыбыцця супрацоўнікаў Міністэрства па надзвычайных сітуацыях адзін з іх быў выратаваны неабыякавымі грамадзянамі. Другога рыбака выцягнуць на бераг не ўдалося — на момант прыбыцця ратавальнікаў ён ужо быў без прыкмет жыцця.

На рыбалку на раку Лоша, якая знаходзіцца ў аграгарадку Гервяты Астравецкага рана, 3 студзеня накіраваліся яшчэ двое мужчын. Рыбачылі на лодцы. З-за неасцярожнасці яна перавярнулася. Адзін з пацярпелых выбраўся на бераг самастойна. Другі патануў.

Дапамога ратавальнікаў у той жа дзень спатрэбілася рыбаку ў Салігорску, які праваліўся пад лёд на мясцовым вадасховішчы. Мужчыну пашанцавала, што побач дзяжурылі супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах, якія апераратыўна выклікалі на месца здарэння МНС.



Як расказаў адзін з ратавальнікаў Ілья Пархімовіч, калі яны прыбылі да месца выкліку, адзін з супрацоўнікаў Таварыства выратавання на водах накіроўваўся да пацярпелага, другі яго страхаваў. «Чалавек знаходзіўся ў вадзе на адлегласці прыкладна каля ста метраў ад берага, — удакладніў супрацоўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. — Лёд быў вельмі тонкім і ламаўся. Мы стрававалі калег на беразе, супрацоўнікі Таварыства выратавання на водах змаглі выцягнуць рыбака. Мужчына знаходзіўся без выратавальнай камізэлькі. Да месца здарэння блізка пад'ехаць было немагчыма, таму разам мы аднеслі адратаванага ў машыну хуткай дапамогі».

Усяго з канца лістапада выратаваны жыцці больш як 20 чалавек, у тым ліку аднаго дзіцяці.

## ЯК ВЫЗНАЧЫЦЬ ТРЫВАЛАСЦЬ ЛЁДУ?

Аднак, выходзячы на лёд, спадзявацца ў непрадбачанай сітуацыі на ратавальнікаў, міліцыянераў або выпадковых мінакоў аматарам зімовай рыбалкі і іншым экстрэмалам не варта. Па-першае, нярэдкія выпадкі, калі сведак надзвычайнага здарэння ўвогуле няма. Рыбакі любяць выбіраць аддаленыя ад населеных пунктаў вадаёмы, пры гэтым не заўсёды папярэджваюць блізкіх, куды яны накіроўваюцца. Па-другое, калі пацярпеламу пашчасціла самастойна выбрацца з палонкі або яму дапамаглі, у моцны мароз нават непрацяглае знаходжанне на вуліцы пагражае сумнымі наступствамі. У залежнасці ад тэмпературы, чалавеку дастаткова правесці ў вадзе ад 5 да 15 хвілін, каб наступіў лятальны зыход. У выпадку з дзецьмі спатрэбіцца яшчэ менш часу...

— Пасля таго як чалавека дасталі з вады, неабходна выклікаць хуткую дапамогу, — адзначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Пацярпелага трэба перамясціць у цёплае памяшканне. Калі побач такога няма, падыдзе аўтамабіль. Затым трэба зняць з пацярпелага мокрае адзенне, сагрэць з дапамогай коўдры, забяспечыць цёплым піццём. Абавязкова дачакацца прыбыцця медыкаў.

Ратавальнікі звяртаюць увагу: пры нулявой, а тым больш плюсавай, тэмпературы паветра, якая захоўваецца на працягу трох сутак, трываласць лёду змяншаецца на 25 %. Адносна бяспечнай лічыцца таўшчыня не менш за 7—10 сантыметраў. Распазнаць трываласць лёду дапаможа колер ледзянога пакрыва. Найбольш моцны лёд мае празрысты сіні колер, слабы — непразрысты белы, крохкі — шэры і шэры «ў крапінку». Правяраць лёд на трываласць неабходна не толькі візуальна. Трэба пастукаць па лёдзе звычайнай палкай (не нагой!). Калі ў выніку вашых дзеянняў з'явілася вада, на такі лёд ступаць не варта. Ніколі не будзе моцным лёд каля вусця рэк і прытокаў, паблізу ключоў, якія б'юць, і сцёкавых водаў. Нетрывалы ён і каля дрэў, кустоў і чаратоў. Катэгарычна забараняецца выходзіць на лёд у перыяды яго замярзання і раставання!

## ВЫРАТАВАЛЬНАЯ КАМІЗЭЛЬКА ЯК ШАНЦ НА ДРУГОЕ ЖЫЦЦЁ

Чалавек, які збіраецца выйсці на лёд, павінен быць падрыхтаваны да ўсяго. Недарэмна ў народзе кажуць: выратаванне тапельца — справа рук самога тапельца. Правільная экіпіроўка захавала жыццё не аднаму аматару зімовай рыбалкі.

Пры выхадзе на лёд рэкамендуецца ўзяць з сабой хоць бы мінімальны набор выратавальных сродкаў: вяроўку, палку, дошку. Не варта свідраваць некалькі лунак побач, збараняецца збірацца на лёдзе вялікімі групамі. Лепш за ўсё рыбачыць у тых месцах, дзе ёсць станцыі Таварыства выратавання на водах — там заўсёды дзяжураць ратавальнікі. У небяспечнай сітуацыі яны абавязкова прыйдуць на дапамогу.

І галоўны атрыбут, якім ніколі нельга грэбаваць нікому, хто выходзіць на лёд, якім бы ён моцным на першы погляд ні быў, — выратавальная камізэлька.

— Шанц выжыць пры наяўнасці камізэлькі самы высокі, — акцэнтуе ўвагу **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ.** — Па-першае, чалавек не пойдзе пад ваду. Гэта крытычна важна з улікам таго, што ў адзенні трымацца на плаве вельмі складана і энергазатратна. Па-другое, наяўнасць камізэлькі аказвае своеасаблівую псіхалагічную падтрымку. Калі чалавек праваліўся пад лёд, то разуменне, што на ім выратавальная камізэлька, дапаможа яму не панікаваць. Гэта таксама надасць упэўненасці ў сабе, ён будзе больш рацыянальны, зможа цвяроза думаць, паклікаць дапамогу і прыняць правільныя рашэнні па самавыратаванні. І, вядома, дапамогу чалавеку ў камізэльцы аказаць значна прасцей не толькі ратавальнікам, але і насельніцтву. Яму могуць працягнуць якую-небудзь вяроўку ці палку, каб ён за іх ухапіўся.

Супрацоўнікі МНС сцвярджаюць: калі б у кожнага другога рыбака была выратавальная камізэлька, то ахвяр было б значна менш. А калі плюс да ўсяго будзе яшчэ і «галава на плячах», то трагедый на вадзе ўвогуле можна пазбегнуць.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота прэс-службы МНС.**

### Што рабіць, калі вы праваліліся

— Не панікаваць! Выратаванне на 90 % залежыць ад упэўненасці і псіхалагічнага стану пацярпелага. Калі паблізу ёсць людзі — клічце на дапамогу.

— Імкніцеся не сыходзіць пад ваду з галавой.

— Перасоўвайцеся да таго краю палонкі, адкуль ідзе цячэнне. Дабраўшыся, паспрабуйце налегчы грудзьмі на край лёду і, закінуўшы нагу, выбрацца на лёд. Нават калі лёд абломваецца, не пакідайце спроб выбрацца наверх.

— Калі асноўная частка тулава апынецца на лёдзе, адпаўзіце ці адкаціцеся далей ад палонкі. Павольна і асцярожна паўзіце да бяспечнага месца, вяртайцеся па сваіх слядах.

— Выбраўшыся на сушу, зніміце і адцісніце мокрае адзенне. Рухайцеся і рабіце сілавыя практыкаванні, развядзіце вогнішча. Выклікайце хуткую дапамогу.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Сусветныя цэнтрабанкі закупілі каля 50 тон золата

У лістападзе мінулага года цэнтрабанкі свету закупілі 49,7 тоны золата ў золатавалютныя рэзервы, вынікае з папярэдніх даных World Gold Council (WGC). Найбуйнейшым пакупніком быў Кітай, які павялічыў запасы на 32 тоны. Прычым да гэтага Народны банк гэтай краіны на працягу трох гадоў не паведамляў аб змене аб'ёму золата ў рэзервах, а ў снежні, па звестках Дзяржаўнага ўпраўлення валютнага кантролю (SAFE), закупіў яшчэ каля 30 тон. Турцыя ў лістападзе дадала да запасаў 19,3 тоны золата, што робіць яе найбуйнейшым афіцыйным пакупніком у 2022 годзе (122,8 тоны за 11 месяцаў), Кіргізія — 3,3 тоны. Асноўнымі прадаўцамі золата ў лістападзе былі Казахстан (3,7 тоны) і Узбекістан (1,6 тоны).

## У Мексіцы накіравалі 1,5 тысячы вайскоўцаў у штат Сіналоа пасля арышту сына наркабарона



Урад Мексікі вырашыў павысіць меры бяспекі ў штаце Сіналоа пасля ўсплёску гвалту, выкліканага арыштам сына наркабарона Хаакіна Гусмана. Як паведаміла Мінабароны ў абнародаванай заяве, у паўночна-заходні рэгіён краіны прыбылі 1500 вайскоўцаў, перадае ТАСС. Раней да аховы правапарадку ў штаце былі прыцягнуты 3,5 тысячы салдат і афіцэраў сухапутных войскаў, а таксама марскіх пехацінцаў і байцоў Нацгвардыі. Сын былога кіраўніка наркакартэля «Сіналоа» Авідзія Гусман Лопес быў злоўлены ў сталіцы штата Кульякане 5 студзеня. Пасля гэтага на вуліцах пачаліся перастрэлкі, узброеныя грамадзянскія асобы нападалі на сілавікоў і блакіравалі дарогі аўтамабілямі, якія гараць. Падчас узброеных сутыкненняў зламыснікі змаглі пашкодзіць два верталёты і самалёт ВПС Мексікі, а таксама борт авіякампаніі Aeromexico. Паводле афіцыйных даных, загінулі 10 вайскоўцаў, 19 злачынцаў былі ліквідаваныя, яшчэ больш чым 20 чалавек прадстаўнікі ўлад затрымалі.

## У Вялікабрытаніі пажылых пацыентаў будуць размяшчаць у атэлях, каб вызваліць бальнічныя ложкі



Сотні пажылых пацыентаў у бліжэйшыя некалькі тыдняў будуць пераведзены з бальніц у гасцінічныя нумары і дамы састарэлых у адпаведнасці з планамі па ўрэгуляванні крызісу ў Нацыянальнай службе аховы здароўя Англіі (NHS). Аб гэтым паведаміла The Times. Міністр аховы здароўя Вялікабрытаніі Стыў Барклай сказаў, што NHS знаходзіцца пад вялізным ціскам з-за Covid, грыпу і стрэптакока А. Акрамя таго, вялікую праблему ўяўляюць забастоўкі. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Рышы Сунак заўважыў, што планы ўрада па паскарэнні выпіскі з бальніц дапамогуць выправіць сітуацыю. Пры гэтым дабрачынная арганізацыя Age UK заявіла, што атэлі «не з'яўляюцца прыдатным месцам для аказання высакаякаснай дапамогі пажылым людзям». Як вядома, супрацоўнікі хуткай дапамогі ў Вялікабрытаніі маюць намер правесці чарговую забастоўку 11 студзеня, а медсёстры — 18 і 19 студзеня.

# АЛІМПІЙСКІ РУХ НЕ МОЖА БЫЦЬ ПОЎНЫМ БЕЗ ПАРАЛІМПІЙЦАЎ

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў падарыў сучасныя зручныя сродкі індывідуальнай мабільнасці (крэслы-каляскі) дабрачыннаму Фонду Аляксея Талая.**

Урачыстая цырымонія прайшла ў Зале алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта. У святочныя калядныя і навагоднія дні, калі ў краіне праходзяць традыцыйныя дабрачынныя акцыі, такое мерапрыемства мае асаблівае значэнне. Сярод яго ўдзельнікаў былі таксама міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Дзмітрый Даўгалёнак, старшыня Паралімпійскага камітэта Беларусі Алег Шэпель і кіраўнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Мар'яна Шчоткіна.

«Алімпійскі рух не можа быць поўным, не можа быць маштабным без паралімпійцаў, без іх волі, мужнасці, цярпення, без уліку таго прыкладу, які яны паказваюць грамадству. Без гэтага не было б згуртаванасці грамадства», — адзначыў Дзмітрый Мезенцаў. Ён заўважыў, што Аляксей Талай сваёй уключанасцю ў грамадскае жыццё дае прыклад многім маладым і дарослым людзям. «Разам з Фондам Аляксея Талая рэалізаваны цікавыя праекты, а ў новым годзе праектаў, якія мы павінны ажыццявіць, яшчэ больш», — сказаў Дзмітрый Мезенцаў.

«Я бязмерна рады супрацоўніцтву з міністэрствамі і ведамствамі нашай краіны. Для нас шчасце быць карысным грамадству. Мы і надалей будзем развіваць нашу дабрачынную дзейнасць і міратворчую дзейнасць, у тым ліку і на тэрыторыі Данбаса і ў іншых месцах. Для мяне гэта вялікая ўзнагарода, прызнанне дзейнасці ўсяго нашага дабрачыннага фонду», — адзначыў Аляксей Талай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Як Цяпа і Каця сталі зоркамі інтэрнэту




Да і пасля выратавання. Калі вам будзе цяжка і здавацца, што няма выйсця, згадайце Кацюшу.

## «ВЫКУПІЛІ КАНЯ, ЯКОГА ГАСПАДАР ЗБІРАЎСЯ ЗДАЦЬ НА МЯСА»

Гісторыя выратавання Каці многаму вучыць: яна прымушае задумацца пра такія якасці, як дабрыня, любоў, вернасць, клопат і давер... Яшчэ зусім нядаўна ў старой і хворай кабылы, якая адслужыла 23 гады верай і праўдай свайму гаспадару, не было ніякіх шанцаў на жыццё. За непатрэбнасцю яе збіраліся здаць на мяса. Але ёй пашчасціла сустрэць на сваім шляху Надзею Літвінюк, якая стала для Каці надзеяй у прамым сэнсе гэтага слова.

Надзея ўсё жыццё пражыла ў горадзе, два гады таму яны з мужам набылі вясковы дамок на Валожыншчыне, дзе праводзяць шмат часу са сваімі трыма дзеткамі. Улетку маладая мама штодзень прагульвалася з маленькай дачушкай па вёсцы. І кожны раз сустракала на сваім шляху суседскую кабылу Кацю. Брудную, худзюшчую...

— Ідзеш, а яна на цябе глядзіць сваімі вялікімі сумнымі вачыма. Я не магла прайсці міма. Падыходзіла да яе, падкормлівала яблычкамі, гладзіла, размаўляла. Ад маці гаспадара, бабулі Софіі, выпадкова даведалася, што сыну кабыла больш непатрэбная, бо ён купіў трактар. Маўляў, засталося бульбу выкапаць і па восені Кацю здадуць на мясакамбінат. Мяне гэта так уразіла, што не магла думаць ні аб чым іншым. У галаве не ўкладвалася, як гэта... Конь можа служыць чалавеку гадамі... Але варта яму проста пастарэць, стаць слабым — і яго спісваюць на мяса, — кажа з горыччу Надзея. — А як жа «мы адказныя за таго, каго прыручылі?..»

Па словах Надзеі, проста па-ранейшаму хадзіць падкормліваць Кацюшу і прыцягваць глядзець ёй у вочы, ведаючы, што яна не сёння дык заўтра можа стаць каўбасой ці кансервамі, яна не магла. Вырашыла, чаго б ёй гэта ні каштавала, выкупіць кабылу ў гаспадара. Ён быў не супраць. Да апошняга прасіў за кабылу дзве тысячы беларускіх рублёў. Потым удалося збіць кошт да 1800.

Надзея з мужам і сябрамі-аднавяскоўцамі пачалі думаць, як сабраць гэтую суму. Так у сацсетках з'явіўся кліч аб дапамозе: «Жыццё кабылы Каці нельга назваць салодкім. Слой гною, нечышчаныя капыты, адсутнасць прагулак, дрэннае харчаванне, цяжкая праца.... Але калі яе прывесці ў парадак: памыць, прычасаць і дапамагчы жыць інакш, яна можа радаваць людзей сваёй прыгажосцю. Спакойная, ручная, добрая. Мы хочам выратаваць яе і просім дапамагчы ў зборы сродкаў на выкуп і ў пошуку новага жылля».

— І, што вы думаеце, многія людзі адгукнуліся, пераводзілі хто колькі мог — хто па 5, хто па 10 і больш рублёў. У выніку мы сабралі неабходную суму і выкупілі Кацюшу. Тым самым падарылі ёй шанц на шчаслівую старасць. Потым праз знаёмых даведалася, што ёсць людзі, якія выратоўваюць коней і адпраўляюць іх у Эстонію. Але Кацюша кастынг не прайшла. У яе выявілі сардэчную недастатковасць. Ветэрынар сказаў, што ў кабылы падчас доўгай паездкі можа не вытрымаць сэрца. Мы ўжо былі ў адчаі, бо нікому стары конь не патрэбны. І тады нам падказалі, што пад Маладзечнам ёсць агарасядзіба «Мара дзяцінства», дзе выратоўваюць жывёл. Маўляў, нядаўна яны забіралі каня ў вельмі дрэнным стане. Раптам і Кацю забяруць. Мы звязаліся з гаспадыняй аграсядзібы Настассяй Чарняўскай, і вось цуд — яна пагадзілася дапамагчы.

Цяпер выратаваная кабыла жыве ў чысціні, есць і п'е, колькі трэба, і гуляе ўдосталь. За пару месяцаў Кацюшу не пазнаць. Надзея паказала мне фотаздымкі, у якім жудасным стане жывёла была ў дзень пакупкі. Гной на жываце зліпся, уеўся ў шэрсць і быў падобны да панцыра. Капыты з-за адсутнасці догляду моцна абраслі, і Кацюша з цяжкасцю перастаўляла ногі. У новым доме яе прывялі ў парадак. Праўда, зрабіць гэта было няпроста: шэрсць разам з закарэлымі кавалкамі гною абстрыгалі ў некалькі падыходаў.

— Каця хутка асвоілася на новым месцы. Насця кажа, што бабуля Каця, як яе там усе называюць з любоўю, цяпер галоўная памочніца ў гаспадарцы: строіць і выхоўвае жарабят, можа за імі прыглядзець, пракантраляваць. А не так даўно здарылася неверагоднае: пасля другой расчысткі капыт Каця паскакала галопам. А тое, што яна стане зоркай TikTok, наогул ніхто не чакаў. Калі гаспадыня аграсядзібы пачала выкладваць відэаролікі, расказваць гісторыю выратавання Кацюшы, падпісчыкі павезлі кабыле гасцінцы — яблыкі, моркву.

Рэабілітацыя і далейшая падтрымка якаснага жыцця патрабуюць пастаянных выдаткаў. Штомесячнае ўтрыманне Каці абыходзіцца ў 300 рублёў. Калі хтосьці хоча дапамагчы — калі ласка: нават 3-5 рублёў лішнімі не будуць. Перадаць грошы можна куратару Каці — Надзеі Літвінюк — альбо асабіста гаспадыні аграсядзібы «Мара дзяцінства». Таксама можна прыехаць да Кацюшы ў госці і пакатацца на іншых конях. Акрамя таго, у новым доме Каці заўсёды рады дапамозе валанцёраў.

— Цяпер мне спакойна, бо ведаю, што лепшага дома для Кацюшы немагчыма ўявіць. І ведаеце, былы гаспадар Кацюшы пранікся і вельмі рады, што кабыла трапіла ў надзейныя рукі і атрымала заслужаны спакой. Калі сустрэла бабулю Софію, яна плакала, дзякавала, казала, што сын ёй паказвае відэа з Кацяй у TikTok.

«...Жартуем з мужам, што катоў выратоўвалі, сабак выратоўвалі, птушак, цяпер конь, а далей хто?» — смяецца Надзея.



## «ЁН УЛЮБІЎ У СЯБЕ АДРАЗУ»

«Жыццё Цяпы» — так называецца тэлеграм-канал, на які я нядаўна падпісалася. Цяпа — кот з мазжачковай атаксіяй. Але гэта яму абсалютна не перашкаджае быць шчаслівым і максімальна абаяльным.

— У 2020-м, калі на ўсіх нас зваліўся каранавірус, — згадвае выратавальніца Цяпы Ганна Крылова, — мая знаёмая ў «Фэйсбуку» перапосціла відэа з рыжым кацянём, якога аддавалі ў добрыя рукі. У аб'яве было напісана, што ў яго прыкметы атаксіі. Малы сапраўды дзіўна рухаўся, але я ўбачыла гэту сімпатычную пыску і... Ён улюбіў мяне ў сябе адразу. Усе выхадныя думала пра тое кацяня. У панядзелак раніцай патэлефанавала па нумары ў аб'яве, і ўжо ўвечары мне прывезлі Цяпу, яму на той момант было каля двух месяцаў. Аказалася, коціка знайшлі добрыя людзі позняй восенню ў дачным пасёлку пад Мінскам...

Пасля знаёмства з «інклюзіўным» катом Ганна даведалася, што ў многіх краінах такія хатнія гадаванцы вельмі папулярныя.

— Іх хутчэй разбіраюць. У нас жа такіх людзей пакуль баяцца браць. Калі шчыра, мне таксама было страшна першыя некалькі хвілін, калі яго прывезлі, бо Цяпа вельмі моцна трэсся. Але ўсё невядомае заўсёды спачатку пужае. Неўзабаве, калі я збольшага ва ўсім разабралася, страх знік. Плюс мяне вельмі моцна падбадзёрыў ветурач майго першага ката. Калі яму паказала тое відэа з «Фэйсбука», Яўген сказаў: «Бяры — разбяромся». Цяпер у ветклініцы ўсе мяне ведаюць як «рыжы кот, які трасецца». Дарэчы, не так даўно даведалася, што дзяўчына, якая працуе там адміністратарам, стараецца забіраць дадому толькі сляпых катоў.

***— Цяпа, напэўна, патрабуе нейкага асаблівага догляду?***

— Многія так думаюць. Але гэта не так. Цяпа самастойна есць тую ж самую ежу, што і ўсе каты, сам ходзіць у латок, гуляе, бегае. У дадатак да таго, у яго яшчэ ёсць рэдкая асаблівасць — калі я кідаю яму цацку, ён імчыцца за ёй і прыносіць назад у зубах, як сабака. Я такое бачыла раз у жыцці і думала: вось бы мне трапіўся такі кот. Акрамя таго, Цяпа вельмі ўважлівы, калі я вяртаюся дадому, абавязкова сустракае мяне каля дзвярэй. Цяпер ён практычна не трасецца, толькі зрэдчас, калі пужаецца ці хвалюецца. Калі ходзіць і бегае, ногі па-ранейшаму распаўзаюцца. Але ў такога ката ёсць вельмі вялікі плюс. На YouTube вельмі шмат ролікаў, як «мурзікі» валяць ёлкі, разварочваюць вазоны, лазяць па сталах. Менавіта з-за гэтага многія людзі не хочуць заводзіць хатніх жывёл. Мой кот ідэальны: ён ходзіць толькі па падлозе. І да маіх шматлікіх кветак Цяпа абыякавы, бо ён фізічна не можа да іх дацягнуцца.

***— Як прыйшла ідэя завесці Цяпу тэлеграм-канал?***

— Сваякі і сябры ў мяне пастаянна пыталіся: «Як там Цяпа пажывае?» Вось я і вырашыла завесці тэлеграм-канал выключна для вузкага кола знаёмых. Сёння сярод маіх падпісчыкаў ёсць людзі, якіх я не ведаю. З часам зразумела, наколькі важна расказваць, што кот з атаксіяй — гэта зусім не страшна. Хочацца, каб людзі звярталі ўвагу і на такіх міленькіх коцікаў, як Цяпа. Мне балюча, калі за вялікія грошы купляюць жывёл, у той час як на вуліцах шмат бясплатных, прыгожых, пухнатых, якія пакутуюць ад голаду і холаду. Дарэчы, менавіта дзякуючы Цяпу ў маёй свядомасці адбыўся пераварот. Раней я нічога не ведала пра такіх катоў. Як і большасць людзей, што, бачачы жывёлу з парушэннямі руху, думала: «Ой, бедненькі коцік». А насамрэч яны такія ж, як і ўсе. Проста ў іх свая норма. Цяпу абсалютна не турбуе, што ў яго распаўзаюцца ногі. Ён упэўнены, што ён ідэальны, прыгожы, і, як любы кот, па-майстэрску маніпулюе мной (*смяецца*). Яму дакладна не патрэбна шкадаванне, яму проста неабходна, каб яго любілі, клапаціліся. Дзякуючы Цяпу я зразумела, што няма людзей з асаблівасцямі. Што чалавек на калясцы такі ж чалавек, як, напрыклад, чалавек з рудымі валасамі ці зялёным колерам вачэй. А мы калясачнікаў выдзяляем, па-асабліваму ставімся, пазбягаем зносін, бо не разумеем, як з імі кантактаваць. Раю паглядзець серыял «Толя-робат» пра правінцыяльнага хлопца, які па дурасці пазбавіўся ног і рук. На працягу ўсяго фільма той даносіць, што ён не нейкі асаблівы, а звычайны. І ў выніку Толя аказваецца больш моцным і жыццялюбным, чым людзі з рукамі і нагамі. І Цяпа такі ж. Менавіта праз такіх жывёл, камунікацыю з імі, мне здаецца, і будуць мяняцца нашы зносіны з «асаблівымі» людзьмі. Прынамсі, гэта бачу па сабе, па сваіх бацьках. Мама спачатку адгаворвала мяне, маўляў, навошта ўскладняць сабе жыццё, вазьмі здаровага коціка. А цяпер у апісанні тэлеграм-канала ў мяне напісана, што Цяпа — адзіны кот, у якога ёсць свая асабістая бабуля. Яна сапраўды да яго ставіцца, як да любімага ўнука: і пахваліць, і пакрытыкуе. Дарэчы, мая сяброўка з Масквы, якая падпісана на мой канал, нядаўна ўбачыла аднавокага хамяка і падумала: «Ну хто ж цябе яшчэ возьме, калі не я». І забрала дадому. Калі мы з Цяпам дапаможам яшчэ каму-небудзь знайсці дом і вернага сябра — гэта будзе проста цудоўна.

...А я думаю: як жа цудоўна, калі людзі гуртуюцца для адной добрай справы. Вядома, можна вырашыць, што ад мяне нічога не залежыць... Але чаму б не паспрабаваць жыць, як і мае героі, па прынцыпе «хто, калі не я». І калі большасць людзей так падумае, свет стане больш шчаслівым.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота дадзены героямі матэрыялу.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ВІТАМІНЫ АД ДЗЕДА МАРОЗА

## Як выбраць замарожаныя гародніну і ягады, якія сапраўды прынясуць карысць здароўю?

**Паняцце «сезонныя прадукты» не тое каб цалкам сышло ў мінулае, але, напэўна, працэнтаў 90 іх у нашы дні ёсць круглы год на прылаўках у свежым выглядзе, асабліва ў буйных гіпермаркетах. І ўсё ж замарожаныя гародніна, садавіна і ягады позняй восенню, зімой і ранняй вясной, то-бок большую частку года, — адна з самых запатрабаваных таварных пазіцый і ў гарадах, і ў сельскай мясцовасці. Гэта зручна для гаспадынь (бо ўсё ўжо памыта і парэзана), гэта смачна (якасная замарозка не надта змяняе смак гародніны і садавіны) і гэта... карысна? Давайце разбірацца.**



Якую б гародніну мы ні ўзялі, пералік яе бясцэнных уласцівасцяў можа заняць не адну старонку. Тое самае датычыцца садавіны і ягад. Вітаміны, мінералы, пекціны, клятчатка, фруктовыя кіслоты падтрымліваюць імунітэт, чысцяць кішэчнік, стымулююць стрававальныя працэсы. Многае з таго, што расце ў парніках і на градках, на палях або ў садах, паскарае абмен рэчываў (капуста, шпінат, сельдэрэй), або нармалізуе водна-салявы абмен (агуркі і кабачкі), або падтрымлівае сэрца (чарніцы, абрыкосы, памідоры). Але ці захоўваюцца гэтыя ўласцівасці пры замарозцы?

### ЭСКІМОСКІ СЛЕД

Тэхналогія так званай шокавай замарозкі, якую выкарыстоўваюць сёння для прамысловай вытворчасці замарожаных агародніных і фруктовых сумесяў, была вынайдзена ў 1930 годзе (яшчэ дакладней — 6 сакавіка) у ЗША. І яе аўтарам быў біёлаг. Кларэнс Франк Бёрдсай удзельнічаў у арктычнай экспедыцыі і там зацікавіўся аўтэнтычным спосабам захоўвання рыбы ў эскімосаў. Паўночныя народы тое, што сёння называюць тэхналогіяй шокавай замарозкі, выкарыстоўваюць з даўніх часоў: пры -45 °С з ветрам рыба замярзае ўмомант. Біёлаг вярнуўся дадому і манетызаваў вынікі сваіх этнаграфічных пошукаў. Сучасная тэхналогія прадугледжвае замарозку прадуктаў пры 35 градусах марозу і пастаянным абдзіманні ледзяным паветрам. Дадзеная працэдура займае ў сярэднім 30 хвілін, і потым прадукт захоўваецца, зноў жа ў сярэднім, 12 месяцаў, не губляючы карысныя ўласцівасці.

Сутнасць у тым, што пры шокавай замарозцы, як можна здагадацца з назвы, прадукты замарожваюцца ў надзвычай сціслыя тэрміны, таму ў тканках утвараюцца вельмі дробныя крышталікі лёду, якія не разбураюць іх структуру. Дома, у маразільным аддзяленні халадзільніка, прадукт замарожваецца значна даўжэй, а таму фрагменты лёду ў тканках атрымліваюцца нашмат буйнейшымі і карысныя ўласцівасці часткова губляюцца.

Тэхналогія шокавай замарозкі назаўсёды змяніла прамысловую харчовую вытворчасць — менавіта яна дазволіла вырабляць паўфабрыкаты, якія складаюць аснову харчавання ў вельмі многіх краінах (у нас пакуль яшчэ прынята гатаваць дома, што называецца, з нуля). Але калі пра карысць усялякіх замарожаных гатовых страў (ад піцы і плову да стрыпсаў і нагетсаў) можна спрачацца, то замарожаныя гародніну і садавіну адназначна варта ўключыць у рацыён, адзначаюць дыетолагі. Вядома, калі замарозка і захоўванне былі якасныя.

У прынцыпе, замарожваць можна любыя садавіну, гародніну, ягады. Але доследным шляхам даўно ўстаноўлена (як-ніяк, у 2020-м тэхналогіі споўнілася аж 90 гадоў!), што лепш за ўсё пераносяць замарожванне і смачнейшыя за ўсё пасля яго квяцістая і брусельская капуста, брокалі, салодкі перац, стручкавая фасоля, кукуруза, морква, шпінат і гарошак. Выдатна падыходзяць для замарожвання і грыбы, у прыватнасці, шампіньёны.

Заўважым, што некаторая гародніна пасля замарозкі набывае больш карысных уласцівасцяў, чым у свежым выглядзе. Напрыклад, пры замарожванні шпінату колькасць кальцыю ў ім узрастае (праўда, захоўваць замарожаны шпінат не рэкамендуецца даўжэй за 4 месяцы: потым карысныя ўласцівасці паступова губляюцца). Гарох пры замарожванні набывае вельмі шмат вітаміну С.

### ЦАНА І ЯКАСЦЬ



Той асартымент замарожанай гародніны, які сёння прапануе гандаль, можна ўмоўна падзяліць на тры вялікія групы. Гэта монагародніна (гародніна толькі аднаго выгляду — напрыклад, спаржавая фасоля, або брокалі, або квяцістая капуста і г. д.), гэта міксы (наборы рознай гародніны альбо ў роўных прапорцыях, альбо з перавагай аднаго-двух кампанентаў: напрыклад, таматаў і перцу або цукіні і морквы). І, нарэшце, сумесі для канкрэтных страў (рагу, плову, баршчу). Ёсць варыянты: бланшыраваная замарожаная гародніна, а таксама гародніна-грыль. Замарожаныя ягады (як і невялікі сегмент марожанай садавіны) звычайна прадстаўлены ў монавыглядзе. Хоць тут таксама можна сустрэць гатовыя сумесі для ўзвараў, морсаў і кісялёў.

Што датычыцца тэрмінаў прыдатнасці, на замарожаную гародніну ён складае ў сярэднім 9—12 месяцаў, на садавіну і ягады — 11—15 месяцаў (хоць некаторыя вытворцы гарантуюць прыдатнасць свайго прадукту на працягу аж 44 месяцаў). Заўважым, што медыкі папярэджваюць: замарожаныя ў хатніх умовах гародніна і садавіна маюць тэрмін захоўвання максімум 12 месяцаў, але лепш спажыць іх за паўгода пасля замарозкі.

Сёння супермаркеты прапануюць спажыўцу замарожаныя гародніну і ягады айчыннай вытворчасці, а таксама расійскія, польскія, турэцкія і егіпецкія. У сярэднім за 400—450-грамовы пакет замарожанай гародніны заплаціць прыйдзецца ад 4,5 да 5,5 рубля. Замарожаная гародніна на вагу каштуе танней — ад 4,5 да 6-7 рублёў за кіло ў залежнасці ад складу сумесі. Пачнём з айчыннага вытворцы. Па замарожанай гародніне тут вылучаецца лаяльнымі да пакупніка суадносінамі кошту і аб'ёму Гродзенскае ТАА «Фірма Мока» (агароднінныя сумесі лініі «Лэдзі Фітнес» можна набыць ад 4 рублёў за 400 г), а таксама ТАА «Правітбел» (Навагрудак) — апошняе прапануе мноства варыянтаў на любы густ: нават сумесь гародніны з пельменямі. У сярэднім беларускія замарожаныя сумесі каштуюць каля 4,84—5,19 за 0,4 кг. З расійскіх брэндаў танней за ўсё «Зимовье» — напрыклад, 3,38 за 400 г сумесі «Папрыкаш». Таксама да найбольш бюджэтных належыць прадукцыя маркі «Летам і зімой».

Да эканомных варыянтаў варта аднесці і прадукцыю ад уласных марак супермаркетаў. Такія маркі (напрыклад, у «Алмі» гэта I'm happy, а ў Green — «Местное известное») прапануюць самыя розныя тавары танней за аналагі. У лінейцы «ўласнай прадукцыі» сярод іншага можа быць і «замарозка». Якасць у гэтым выпадку залежыць ад таго, з якім прадпрыемствам крама заключыла кантракт. Так што па кожнай таварнай пазіцыі тут трэба высвятляць пытанне доследным шляхам. Ну, і, вядома, уважліва чытаць інфармацыю аб вытворцы на ўпакоўцы.

Што датычыцца замарожаных ягад, то яны даражэйшыя за гародніну. Брусніцы «Зімой і летам», напрыклад, абыдуцца ў шэсць рублёў за 300 г, польская вішня без костачкі на вагу — 10,99 за кіло, егіпецкія клубніцы — 7,99 за кг, а айчынныя ажыны ад ТАА «Фірма Мока» (Гродна) — 5,99 за 300 г. Той жа аб'ём расійскай абляпіхі будзе каштаваць 5,15 рубля. Цэны на маліны і чарніцы моцна вар'іруюцца ў залежнасці ад вытворцы. Адносна недарагія варыянты, напрыклад, па чарніцах — беларускія ад «Мар'іна» (6,45 за 300 г) і расійскія ад «Летом и зимой» — 5,99 за той жа аб'ём.



Як выбраць якасную замарожаную сельгаспрадукцыю так, каб сапраўды атрымаць карысць?

— На якасць замарожанага тавару ўплывае шэраг параметраў, — распавядае кансультант гандлёвай залы аднаго з мінскіх гіпермаркетаў. — Галоўны з якіх — магчымы тэмпературны збой пры транспарціроўцы або захоўванні, пры якім прадукт размарозіўся.

Адзначым, што размарожваць і зноў замарожваць хутказамарожаныя прадукты нельга — яны цалкам губляюць усе карысныя ўласцівасці.

На што звярнуць увагу пры выбары замарожанай гародніны?

• На тэмпературу ўнутры ларавітрыны. Супрацоўнікі крам адзначаюць, што звычайна яна складае -18 °С, і гэта аптымальна для захоўвання такой прадукцыі (на лары-халадзільніку звычайна можна ўбачыць градуснік).

• На цэласнасць упакоўкі. Як тлумачаць прадаўцы, у ідэале замарожаныя плады варта ацэньваць па вонкавым выглядзе. Шматкі павінны быць прыкладна аднолькавага памеру — гэта кажа аб якасці замаразкі. Ягадкі або кавалачкі гародніны не павінны быць зліплымі і мець вялікія «нацёкі» лёду (гэта сведчыць, што прадукт размарожваўся і зноў замарожваўся). Таму прадукцыя без упакоўкі, якую награбаюць лапатачкай у пакет і ўзважваюць самастойна, можа быць больш бяспечна за ўпакаваную, калі, вядома, усе правілы яе захоўвання выкананыя.

— Але пакупнікі часцей аддаюць перавагу спакаванай «замарозцы», — тлумачыць кансультант.

Упакоўка, як правіла, не празрыстая — разглядзець, што там у ёй знаходзіцца, немагчыма. Але ёсць варыянт «памацаць». Унутры не павінна быць зліплых камякоў, лёду і снегу, а на пакеце — імжы, і ён не павінен быць вільготны.

• На тэрмін захоўвання (ён не павінен, зразумела, скончыцца) і дату вырабу. Апошняя павінна супадаць з прыкладнымі тэрмінамі паспявання ўраджаю адпаведных культур у адпаведным рэгіёне. Гэта гарантыя, што замарозілі сапраўды свежую гародніну, садавіну, ягады або грыбы на піку іх тэхнічнай спеласці. Менавіта з гэтага пункту гледжання лепш выбіраць прадукцыю айчыннага вытворцы — і тэрміны паспявання тых ці іншых дароў прыроды добра вядомыя пакупніку, і гатовы прадукт не везлі здалёк, а значыць, ён не размарозіўся па дарозе. І наогул, чым хутчэй гародніна, садавіна або ягады перамесцяцца з-пад сонейка ў маразільнае абсталяванне, тым больш карысны будзе канчатковы прадукт. Дарэчы, эксперты адзначаюць, што замарожаныя «дары прыроды» пры правільнай тэхналогіі іх збору, мыцця-сушкі і замарозкі захоўваюць больш за 85 % усіх карысных рэчываў (у тым ліку вітамінаў). Ці можна сказаць тое ж самае аб цяплічнай, «гідрапоннай» зімовай сельгаспрадукцыі? Хітрасць тэхналогіі ў тым, што нізкая тэмпература рэзка ставіць «на паўзу» ўсе працэсы ўнутры тканак. І мы, па сутнасці, зімой ядзім «летні» плод.

### ВІТАМІНЫ З МАРАЗІЛКІ

— Часцей за ўсё, — распавялі прадаўцы аднаго са сталічных гіпермаркетаў, — пакупнікі выбіраюць стручкавую фасолю, а таксама квяцістую капусту і брокалі. Выкарыстоўваюць гэтую гародніну для супоў, а галоўным чынам — для гарніраў да мяса і рыбы. Добра прадаюцца ягады для ўзвараў і морсаў: звычайна іх набываюць для дзяцей. Прычым мамы аддаюць перавагу монасумесям (клубніцы, вішня, маліны, ажыны, брусніцы, чарніцы, буякі). Гатовыя сумесі для ўзвараў чамусьці карыстаюцца меншай папулярнасцю.

— Асабіста я заўсёды, аплаціўшы на касе замарожаную гародніну або ягады, шчыльна загортваю пакет у фольгу, — дзеліцца «лайфхакам» адна з пакупніц. — Так пакеты не адтайваюць, нават калі на вуліцы плюсавая тэмпература, і іх можна спакойна пакласці ў маразілку.

Што вы гатуеце з замарожанай гародніны? Аб гэтым мы спыталі пакупніцу «Еўраопта». Аказалася, супы, гарніры, а калі ёсць час і жаданне, то і рознага роду стравы з мясам, жульены, цёплыя салаты. Невідавочны варыянт — французскі пірог кіш, які, аказваецца, спячы лёгка.

— Проста выкладваем замарожаны агароднінны мікс «Гавайская сумесь» або «Мексіканская сумесь» на «падушку» з любога несалодкага цеста і заліваем зверху міксам яек, смятаны і сыру, узбітым міксерам на павольнай хуткасці. Дваццаць хвілін у духоўцы, і пірог гатовы, — падзялілася рэцэптам з чытачамі «Звязды» маладая мама Ірына.

Што прыгатаваць з замарожаных садавіны і ягад, акрамя ўзвараў і выпечкі, нам распавяла іншая пакупніца:

— Мая фірменная «зімовая» страва — варэнікі з замарожанымі ягадамі. Унукі ядуць з задавальненнем. Можна купіць гатовае цеста для варэнікаў, але тады страва атрымліваецца дарагаватай. Танней, ды і смачней прыгатаваць цеста самастойна. Гэта нескладана. На паўкіло мукі — адно яйка, паўкружкі цёплай вады і соль. Вымешваем, раскатваем і наразаем на кружочкі. У кожны кружочак кладзём ягады не размарожваючы. Пасыпаем іх цукрам і зашчыпваем. Варым пяць хвілін пасля ўсплывання, і застаецца толькі паліць варэнікі смятанай.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Гэта мы

# «ЕХАЦЬ ТРЭБА ЎСІМ, А ЗНАЧЫЦЬ, ТРЭБА І МЕРКАВАЦЦА...»

**Якія мы, беларусы? Свой адмысловы адказ на гэтае пытанне могуць даць сацыёлагі, пісьменнікі, фалькларысты... Але ж можна і самім прыглядацца да людзей, да канкрэтных жыццёвых сітуацый і наноў адкрываць найлепшыя нашы рысы: прыветлівасць, разважлівасць, працавітасць, прыхільнасць да сямейных каштоўнасцяў, любоў да роднай зямлі.**

## На бацькаўшчыне

У сям'і маёй сяброўкі — госці: прыехаў стрыечнік мужа, ажно з Сібіры. Сустрэчы рады ўсе — гаспадар, гаспадыня, двое іхніх дзяцей, а найбольш — той сібірскі беларус. Тут, на радзіме сваіх бацькоў і дзядоў, ён быў толькі аднойчы, у маленстве. Таму цяпер, у сталым узросце, яго цікавіць усё: людзі, парадкі, стравы, прырода, звычкі...

Беларускі бок, вядома ж, стараецца дагадзіць: гаспадыня частуе адмысловымі стравамі, гаспадар возіць сваяка да іншай радні.

Перапоўнены пачуццямі сібірак не хавае свайго захаплення:

— Я, вядома ж, чуў, што беларусы людзі гасцінныя, але каб настолькі... Ніколі не забуду, як мяне тут прымалі!..

Па ўсім відаць: раней, да гэтага прыезду, Беларусь для яго была радзімай бацькоў, цяпер, падобна, яго самога.

## Сіла зямлі

Мікалаеўне ўжо за восемдзясят, шмат гадоў, падчас якіх хапіла ўсяго — і горкага, і салодкага, а найбольш — працы. Змалку асірацеўшы, яна рана ўсвядоміла, што разлічваць можа толькі на сябе. І таму — куды б ні трапіла, дзе б ні жыла — заўжды сумленна і шмат працавала.

Нават пасля выхаду на пенсію: трымала дом, а ўжо на лецішчы дык і наогул стварылі з мужам сапраўдны рай.

...Два гады таму яе Пятровіча не стала, і ўдаву як падмянілі: няма больш ні ранейшага спрыту, ні здароўя. Дактары забараняюць цяжкае падымаць, нахіляцца... «А мне б на дачу, — ледзь не плача жанчына. — Я б там кожны грудок зямлі ў руках перацерла, кожную раслінку дагледзела і, далібог, паправілася б!»

...Хочацца ў тое верыць, бо яна ж, відаць, і сапраўды гаючая — сіла роднай зямлі.



## Наказ

Некалі гэта радзіна была вялікай і дружнай: усе разам з ахвотай з'язджаліся на розныя святы, на дапамогу адно аднаму... Цяпер, на жаль, збіраюцца на пахаванні: у лепшы свет спакваля сыходзяць старэйшыя. Вось і дзядзькі Івана не стала — вялікага працаўніка, сумленнага чалавека.

Пра яго за жалобным сталом гаварылі і хораша, і шмат...

У цёткі Ганькі на ўсе прамовы (а найбольш на пранікнёную Валіну) свая, адмысловая рэакцыя:

— Валечка, я ж таксама ўжо збіраюся... Усё падрыхтавала... Дык ты ўжо, як памру, і пра мяне што харошае скажы, каб людзі слязу пусцілі!..

На першы погляд, дзіўнае пажаданне. На другі — «паміраць збірайся, а жыта сей», то-бок думай, якую памяць аб сабе пакінеш, якія словы прагучаць наўздагон.

## Менталітэт і... грамадскі транспарт

Пра нашу славутую памяркоўнасць напісана і сказана шмат. Але, напэўна, нідзе яна не праяўляецца ярчэй, чым у грамадскім транспарце. «Людцы, ці ж мы не славяне? Давайце пацяснімся крыху, каб усе зайшлі!» — гэты «патрыятычны» покліч у нашым прыгарадным аўтобусе гучаў вечарам. «Панаядаюцца бліноў — не разміну цца!» — жартаваў хтосьці раніцай.

І не марна: у перапоўненым, здавалася б, аўтобусе знаходзілася месца і для новых пасажыраў, і для аб'ёмных клункаў... Ніхто ніколі не сварыўся, бо кожны разумеў: ехаць трэба ўсім, а значыць, і меркавацца.

Такі ўжо ў нас характар.

**Ірына Матусевіч,**
*Дзяржынскі раён.*

---

Дзякуй!

# СЯРОД ДОБРЫХ ЛЮДЗЕЙ

**Аб тым, што недзе здарыўся пажар, што пацярпелі, а то і загінулі ў агні людзі, цяпер, на жаль, паведамляюць часта. Мая мама тады кожны раз перажывае, кажа, што злодзей хоць вуглы за сабой пакідае, а вось агонь — той нічога. І гэта ў яе не проста словы, гэта перажытае і незабытае.**

Першы раз мама ад пажару пацярпела ў гады вайны, калі фашысты спалілі амаль палову вёскі. Другі — калі суседскія дзеці, пагуляўшы з запалкамі, падпалілі нашу новую, толькі што збудаваную хату.

Быў і трэці пажар.

...Тым цёмным восеньскім вечарам мяне і малодшага брата мама ўкладвала спаць і раптам моцна загаласіла, рынулася з хаты. Гарэў наш хлеў. Тата кінуўся ратаваць скаціну, мама — крычаць, склікаць людзей, цягаць ваду з калодзежа ды ліць яе на агонь.

Хутка на дапамогу ім з вёдрамі ды баграмі сталі збягацца вяскоўцы, аднак вогнішча шалела ўсё больш і больш. Гарэла сена, яго — уся зіма наперадзе — бацькі назапасілі шмат, таму справіцца з полымем было немагчыма.

Для таго каб агонь не перакінуўся на хату, вяскоўцы ўжо яе палівалі вадой...

А нарэшце, калі сена згарэла і небяспека як быццам мінула, усе — і яны, і мы, малыя, праз вакно, праз слёзы моўчкі глядзелі на тое, што засталося ад такой вялікай будыніны.

...Назаўтра ні нашы веснічкі, ні дзверы ў хату амаль не зачыняліся: людзі прыходзілі, каб падтрымаць і разважыць, каб прапанаваць дапамогу, мужчыны прыносілі сена для ўратаванай кароўкі і нашых авечак.

Аднак шмат яго прынесці не мог ніхто, бо ў кожнага ж свая скаціна, а зіма пакуль нават не пачыналася...

Авечак тады забраў адзін з нашых сваякоў, карову ў свой хлеў паставіў татаў брат...

Да сёння ў памяці і абоз: мужчыны з суседняй вёскі едуць па сена ў калгаснае гумно для калгасных кароў. Згледзеўшы гэта, мама тут жа апранаецца і садзіцца ля акна — чакае. Зараз падводы будуць ехаць назад, і з кожнай, на хвілінку прыпыніўшыся, фурман, рызыкуючы атрымаць наганяй, скіне для нашай рагулі хоць колькі ахапачкаў сена.

Яго — каб, крый божа, не падвесці людзей — мама старалася тут жа знасіць, схаваць у прыбудоўцы ад хцівых вачэй. На дапамогу ёй часцяком прыбягалі суседкі.

...Я часта ўспамінаю сваю вёску, сваіх аднавяскоўцаў: успамінаю з цеплынёй і шчырай павагай, з удзячнасцю за тое, што ў цяжкую хвіліну яны ўмелі аб'яднацца. Каб дапамагчы.

**Ірына Салата,**
*г. Гродна.*

---

Клопат

# Сто грамаў... Хто іх заўважыць?

**Даўно не сустракала ў газеце рубрыкі «Накіпела». Можна падумаць, што цяпер градус панізіўся, што людзей нічога не абурае — нават сітуацыя з цэнамі! Іх жа — ну сапраўды, калі верыць тэлевізару, і адсочваюць, і трымаюць пад кантролем, і ўверх не «пушчаюць», а як прыгледзішся, дык раслі яны і растуць, прычым самым бессаромным чынам.**

Здавалася б, усё проста: ёсць сістэма метрычных мер. Адпаведна, і пры вытворчасці, і пры пастаўках-закупках усё ўлічваецца ў кілаграмах, тонах, літрах, дэкалітрах. Значыць, акурат гэтаксама, калі я правільна разумею, і прадавацца павінна?

Аж не: ледзь не ўсё цяпер фасуецца і разліваецца па 710, 730, 780, 810, 830, 870, 930, 980 грамаў. Брусочак масла на маёй памяці заўсёды важыў 200 грамаў, потым стаў 180, цяпер — 160 (а цана пры гэтым — ліча — ранейшая!). Тое ж самае адбываецца з крупамі, з хлебам, з малаком, нават з півам. У бутэльцы з ім ужо не два літры (за тую ж цану), а на сто грамаў меней. Вытворца, мусіць, вырашыў, што вось такога дробнага недаліву пакупнікі не заўважаць, а яму — ды ў маштабах вытворчасці — прыбытак будзе...

І ніякіх, напэўна, думак аб тым, што гэта падман, прычым не дробны, а ў «асабліва буйных памерах», падман, якога чамусьці ніхто не бачыць. І якога, магчыма, не было б, калі б заставаліся ранейшыя правілы фасоўкі...

Праўда, апошнім часам вытворцаў прымусілі пісаць на цэнніках цану менавіта за іх, за кілаграмы, але ж дробненька-дробненька... Хоць ты ў краму з лупай хадзі!

А з іншага боку — вопыт прымусу ёсць. Дык можа, прымяніць яго ў адносінах да фасоўкі і хоць такім чынам спыніць неабгрунтаваны рост цэн — такі здзеклівы ў адносінах да пакупніка і гэткі непрыстойны з боку вытворцаў.

...Нехта можа запярэчыць мне, сказаць, што ў святле апошніх падзей ім таксама цяжка, што без росту цэн — ну ніяк!

Калі гэта і сапраўды, калі іншага выйсця няма, то — што зробіш? — я асабіста згодная: няхай тыя цэны растуць, але ж празрыста, абгрунтавана, без гэтых недаліваў і недаважак: няхай у пакеце, як некалі, будзе кілаграм грэчкі, у пачку — 200 грамаў масла і г. д. А то ж алею ў бутэльцы нядаўна з крамы прынесла ўжо не літр, а 980 грамаў. За тыя ж грошы. Як гэта назваць? Для мяне — падман.

...Пэўныя органы просяць паведамляць пра іх, пра непарадкі з цэнамі. Таму і паведамляю.

**С. Вараковіч,** *г. Мінск.*

---

Чалавек — чалавеку

# Пасееш прывычку — пажнеш характар

**Што было — было: не так даўно, хоць і у мінулым стагоддзі, зарплату выдавалі гатоўкай, так званымі наяўнымі, праз акенцы кас.**
**На цагляным заводзе гэту работу даверылі ўчарашняй школьніцы Каці. Не паступіўшы ў інстытут, яна не захацела сядзець на шыі ў бацькоў — пайшла працаваць.**

Не сакрэт, што самымі цяжкімі ў яе былі два дні — зарплаты і авансу, а ў астатнія вольны час з'яўляўся. «Ты ж глядзі, не сядзі там — нечаму вучыся, прасі работу», — падказвалі ёй бацькі. Каця слухалася і нейкія заданні бухгалтараў выканаць магла, але ж потым... «На, перапішы вось гэтыя дакументы, — аднаго разу папрасіла галоўная бухгалтарка, уручыўшы дзяўчыне папку з паперамі. — Толькі ж будзь уважлівай!»

Не звярнуўшы ўвагі на смяшок калег, Каця тут жа ўзялася за справу.

...Толькі праз гады, скончыўшы ВНУ і атрымаўшы прафесію бухгалтара, яна зразумела, чаму тады смяяліся жанчыны: разам з той папкай ёй давалі звычайную «пустышку», каб не сядзела склаўшы рукі, каб не перашкаджала іншым, каб прывыкала працаваць.

Нездарма ж людзі кажуць: «Пасееш прывычку — пажнеш характар».

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

---

Усмешачку

# ПЕСНЯ БЫЛА НЕ ТАЯ... ЦІ ТАЯ?

**У пачатку 60-х дзядзька Уладзя быў яшчэ проста Уладзікам, у школу хадзіў і адтуль, на жаль, часцяком вяртаўся засмучаным.**

Бацька, згледзеўшы гэта, заўжды казаў:

— Ну давай, паказвай дзённік.

Малы хоць-нехаць даставаў яго з партфеля, разгортваў на патрэбнай старонцы. У той раз там красавалася вялікая тлустая двойка.

— Ізноў? Сынок, ну што ж ты?.. Два балы па матэматыцы яшчэ можна зразумець (прадмет табе дрэнна даецца), але ж каб па спевах... За што? — стаў дапытвацца бацька. — Ты ж гарлапаніш на ўсё сяло! Ты ж не фальшывіш, як быццам?

— Дык настаўніца хацела праверыць, — пачаў расказваць малы. — Усіх па чарзе выклікала да дошкі, каб спявалі ёй «Взвейтесь кострами, синие ночи...» А я ў гэтай песні словы забыўся — заспяваў падобную: «Вялік святы нам дзень настаў»...

Бацька, пачуўшы гэта, хіба ўздыхнуў: у тыя атэістычныя часы двойка за падобныя спевы была яшчэ боскім пакараннем.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

---

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны смерці былога супрацоўніка газеты «Звязда», лаўрэата Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі, аўтара многіх гісторыка-краязнаўчых і асветніцкіх кніг, пісьменніка, публіцыста Віктара Уладзіміравіча ХУРСІКА і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
11 студзеня 2023 г. № 51 (687)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

# З УДЗЯЧНАСЦЮ І КЛОПАТАМ



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА

## У рамках рэспубліканскай навагодняй дабрачыннай акцыі «Ад усёй душы» Наталля Качанава наведала дом-інтэрнат для пенсіянераў і інвалідаў





**Звяртаючыся да жыхароў дома-інтэрната, Наталля Качанава павіншавала іх з Новым годам, а таксама падзякавала за неацэнны ўклад у пабудову суверэннай Беларусі:**

— Хтосьці з вас застаў страшнае ваеннае ліхалецце, хтосьці ўжо пасля вайны аднаўляў краіну з руін, ствараючы сваёй працай тыя выгоды, якія ёсць у нашага маладога пакалення, вучыў дзяцей, лячыў людзей, рабіў усё, каб мы сёння жылі ў такой прыгожай краіне. Мы па праве ганарымся нашай Беларуссю, таму што няма на зямлі такога месца, як наша родная краіна, мы яе бязмерна любім. І ўсё гэта дзякуючы вам, людзям старэйшага пакалення, якія рабілі ўсё, каб ніколі будучыя пакаленні не сутыкнуліся з трагедыяй вайны. Нізкі вам паклон. Прэзідэнт нашай краіны клапоціцца пра кожнага чалавека: дзіця, пенсіянера, працаздольнага. Усё, што робіцца ў Беларусі па сацыяльнай абароне грамадзян і сацыяльным дабрабыце, — дарагога варта.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла цеплыню атмасферы, якая пануе ў доме-інтэрнаце:

— Я атрымала вялікае ўражанне, пабачыўшы выдатныя работы, якія вы тут ствараеце. Я ўбачыла, што кожны з вас мае справу: хтосьці на рэабілітацыі, хтосьці вырабляе творы мастацтва, вы разам сябруеце, спяваеце, танцуеце. Няхай Бог ахоўвае вас, здароўя, радасці і цеплыні ў зносінах, любіце адно аднаго. Я шчыра дзякую супрацоўнікам установы: нізкі вам паклон, гэта работа, якая патрэбна нам усім. А нашай краіне — росквіту і міру, недарма гэты год Прэзідэнт абвясціў Годам міру і стварэння: гэта самае галоўнае. Як бы мы ні жылі, мы разумеем: толькі мір дае чалавеку магчымасць жыць спакойна. Спакойна за сваіх родных, блізкіх, за ўсіх, хто побач з табой, за ўвесь народ Беларусі, — павіншавала жыхароў і супрацоўнікаў дома-інтэрната Наталля Качанава.

На сёння ва ўстанове пражывае амаль 360 чалавек: гэта інваліды I і II групы, а таксама пенсіянеры. Галоўная задача дома-інтэрната — стварэнне камфортных і бяспечных умоў знаходжання, распавяла **дырэктар Наталля ЗЫЧКОВА**. Створаныя ўмовы даюць людзям шмат магчымасцяў — гэта не толькі рэабілітацыя і сацыялізацыя, але і разнапланавыя музычныя, мастацкія, тэатральныя гурткі.

— Супрацоўнікі і насельнікі называюць гэтае месца проста домам. Кожны чалавек, незалежна ад свайго ўзросту, можа апынуцца ў складанай сітуацыі, і вельмі важна, каб побач быў такі чалавек, які можа стаць апорай. У дадзеным выпадку гэта дзяржава і тыя людзі, якія працуюць у нашай установе: тут вельмі творчы калектыў, які стварае ўсе ўмовы, каб нашы падапечныя маглі не толькі смачна харчавацца і спаць, але і каб кожная іх хвіліна была занята. Што трэба чалавеку? Крышачку ўвагі і клопату. Гэта вельмі важна і ўласціва нашаму дому.

Наталля Зычкова адзначыла, што ва ўстанову трапляюць адзінокія людзі, а таксама пенсіянеры, чые дзеці пражываюць за мяжой:

— Нашай самай старэйшай пражывальніцы, Вользе Альховік, на сёння 103 гады: мы адсвяткавалі гэтую дату зусім нядаўна, напрыканцы снежня. Вольга Клімаўна сама піша вершы і чытае іх. Хачу сказаць, што, дзякуючы клопату і створаным умовам, жыццё падаўжаецца. Гэта наша галоўная задача: упэўніць, што ў любым узросце жыццё цудоўнае — і ў 70, і ў 80 або 100 гадоў.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Нашым дзецям ад нашых сенатараў

## Члены Савета Рэспублікі падарылі дзецям свята

У святочныя навагоднія і калядныя дні члены Савета Рэспублікі змянілі кабінеты і нарады на ранішнікі і сустрэчы з дзецьмі. Сенатары прынялі актыўны ўдзел у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці». Па традыцыі — з падарункамі і шчырымі сустрэчамі. **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** наведала ДУА «Бярозаўскі раённы цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі», Дзіцячы гарадок Ленінскага раёна Мінска, сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Ленінскага раёна Мінска. Не абышлося без навагодніх падарункаў і для самой Наталлі Качанавай: 12-гадовы Кірыл з Лепеля падчас сустрэчы з членам Савета Рэспублікі Юрыем Дзеркачом перадаў ёй зроблены сваімі рукамі гліняны герб. Наталля Іванаўна расчуленая сюрпрызам юнага лепяльчаніна, перадала яму паштоўку з віншаваннямі, сувеніры і салодкія сюрпрызы.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** наведаў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Сацыяльна-педагагічны цэнтр з прытулкам Заводскага раёна г. Мінска». Сенатар выказаў словы падзякі педагогам за іх высакародную працу па падтрымцы дзяцей з неўладкаваных сем'яў і перадаў сертыфікат для набыцця мэблі ў спальныя пакоі. **Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах,** у рамках акцыі «Нашы дзеці» павіншавала вучняў спецыяльнай школы № 13 горада Мінска для дзяцей з парушэннем слыху і азнаёмілася з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы, а таксама ўмовамі навучання і пражывання дзяцей.

**Віктар ЛІСКОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці** ўзяў удзел у губернатарскай ёлцы ў Гродне, якая таксама праводзілася ў рамках акцыі «Нашы дзеці». На свята сабралася каля 800 хлопчыкаў і дзяўчынак з Гродзенскай вобласці — выдатнікі вучобы, пераможцы творчых конкурсаў, інтэлектуальных алімпіяд і спартыўных спаборніцтваў, выхаванцы дзіцячых дамоў сямейнага тыпу і дзеці са шматдзетных сем'яў.

Сям'ю Баярскіх, дзе выхоўваецца чацвёра дзяцей, са святамі павіншаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ**. Шматдзетная маці, ураджэнка Казахстана, працуе ў сферы аховы здароўя. Сяргей Сівец выслухаў пытанні, з якімі сутыкнуліся члены сям'і пры атрыманні грамадзянства Рэспублікі Беларусь, і ўзяў іх вырашэнне на асабісты кантроль.

**Члены Маладзёжнага савета (парламента) пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь** узялі ўдзел у навагодніх дабрачынных акцыях «Будзь побач», «Нашы дзеці», «Дабро вылечыць душу», «Цуды на Каляды». Маладыя парламентарыі наведалі сацыяльна-педагагічныя цэнтры, спецыялізаваныя дамы дзіцяці, спецыяльныя школы-інтэрнаты, педыятрычныя аддзяленні бальніц, установы аховы здароўя і адукацыі.

Сенатары віншавалі не толькі беларускіх дзяцей. **Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Дзмітрый БАСКАЎ** паўдзельнічаў у акцыі фонду Аляксея Талая па арганізацыі знаходжання школьнікаў з Данецкай і Луганскай рэспублік у Мінску. Дзеці з ДНР і ЛНР паспелі не толькі азнаёміцца з культурнай спадчынай і спартыўнай інфраструктурай беларускай сталіцы, але і прайсці шэраг аздараўленчых і рэабілітацыйных працэдур.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Наталля КАЧАНАВА — старэйшынам:

# «МЫ ЎВАЙШЛІ Ў ПАЛІТЫЧНА ВАЖНЫ МОМАНТ НАШАГА ЖЫЦЦЯ»

**На завяршэнне мінулага года ў Савеце Рэспублікі на чале з Наталляй Качанавай прайшло пасяджэнне савета старэйшын. Галоўнымі тэмамі сустрэчы сталі сямейныя каштоўнасці, значнасць работы дэпутацкага корпуса, а таксама Усебеларускі народны сход.**


Фота БелТА.

Падчас пасяджэння Старшыня Савета Рэспублікі адзначыла, што законапраект аб УНС практычна адпрацаваны для таго, каб прымаць яго ў Палаце прадстаўнікоў і ў Савеце Рэспублікі:

— Мы актыўна ўключаліся ў работу над гэтым законапраектам. У нас з'яўляецца яшчэ адзін дзяржаўны орган, які будзе стабілізацыйным у тых выпадках, калі трэба будзе прымаць важныя рашэнні для краіны. Члены Савета Рэспублікі ўваходзілі ў склад Канстытуцыйнай камісіі. На мой погляд, беларусы паказалі сваю пазіцыю, калі прыйшлі на рэферэндум і выказаліся ў падтрымку навел, унесеных у Асноўны Закон краіны. Цяпер у развіццё гэтага мы працуем над законамі, якія трэба прывесці ў адпаведнасць. А іх даволі шмат, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Звяртаючыся да ўдзельнікаў сустрэчы, Старшыня Савета Рэспублікі скіравала ўвагу на асаблівую важнасць работы дэпутацкага корпуса ў сучасных рэаліях:

— Мы ўвайшлі ў палітычна важны момант нашага жыцця — 25 лютага 2024 года ў нас адбудзецца, у адпаведнасці з новай Канстытуцыяй, адзіны дзень галасавання, калі мы будзем выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў — пачынаючы з сельскіх Саветаў і заканчваючы Саветам Рэспублікі. Прычым у вельмі сціслыя тэрміны. А праз два месяцы — да 25 красавіка — мы павінны будзем ужо сфарміраваць Усебеларускі народны сход. Таму што члены Савета Рэспублікі, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў уваходзяць у склад дэлегатаў УНС. Гэта накладвае на нас асаблівую адказнасць.

Падсумоўваючы вынікі сустрэчы, **член Савета Рэспублікі трэцяга і чацвёртага скліканняў Надзея ЕРМАКОВА** адзначыла, што ўсе сілы народа павінны быць накіраваны на захаванне моцнай краіны:

— Самае галоўнае, каб мы былі аб'яднаныя дзеля таго, каб умацоўваць, развіваць Беларусь, захоўваць мірнае неба над галавой.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# З УДЗЯЧНАСЦЮ І КЛОПАТАМ

*(Заканчэнне на 7-й стар.)*

Усе людзі, якія трапляюць у дом-інтэрнат, самі абіраюць умовы знаходжання. Гэта можа быць кароткатэрміновае — да трох месяцаў, часовае — да года, або пастаяннае. Пенсіянер Юрый Тананыкін, які сёлета адзначыць свой 75-гадовы юбілей, распавёў, што пражывае ў домеінтэрнаце ўжо амаль год:

— Нягледзячы на афіцыйную назву ўстановы, мы ўсе прывыклі называць гэта проста домам. У нас вялікая сям'я: і супрацоўнікі, і жыхары. Мы знаходзімся ў добрых умовах: гаворка ідзе не толькі аб пражыванні і харчаванні — ніякіх жыллёва-бытавых пытанняў нават не паўстае. Калі вы хочаце памяняць ложак — мяняйце хоць кожны дзень. Харчаванне таксама без абмежаванняў. Заняткі па гусце: можаш цэлы дзень ляжаць і глядзець тэлевізар. Але мне больш падабаецца займацца музыкай, я іграю на акардэоне і піяніна, — падзяліўся пенсіянер.

Пасля святочнага канцэрта, зладжанага для жыхароў дома-інтэрната, Старшыня Савета Рэспублікі ўручыла ўстанове сертыфікат для набыцця неабходнага абсталявання, а таксама салодкія пачастункі. У сваю чаргу, калектыў дома-інтэрната прэзентаваў звязаныя ў творчай майстэрні цёплыя рэчы.

— Вялікі дзякуй, паважаныя сябры. Я ведаю, што ў гэтых рэчах ёсць часцінка цеплыні ўсіх вашых сэрцаў. Я з вялікай радасцю буду гэта насіць, успамінаючы вас кожны дзень. Наша добрае сяброўства, несумненна, будзе працягвацца: мы будзем наведваць вас і сустракацца, — паабяцала Наталля Качанава.

**Арына КАРПОВІЧ.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ЗВАРОТ І ВЫНІК

## Як сенатары дапамагаюць людзям вырашаць праблемы

**Сёння члены Савета Рэспублікі праводзяць адзіны дзень прыёму грамадзян у горадзе Мінску. Наталля Качанава і сенатары пабываюць ва ўсіх раёнах сталіцы, сустрэнуцца з жыхарамі, выслухаюць іх просьбы, прапановы і скаргі, па магчымасці акажуць садзейнічанне ў вырашэнні пытанняў, якія хвалююць людзей. Такая форма зваротнай сувязі з людзьмі не новая. Прыёмы грамадзян запатрабаваныя ў насельніцтва. На жаль, не ўсе пытанні знаходзяцца ў кампетэнцыі мясцовых органаў улады.**
**Ды і не ўсе чыноўнікі, калі шчыра казаць, хочуць унікаць у праблему канкрэтнага чалавека. Невыпадкова людзі ідуць туды, дзе ім сапраўды дапамогуць, — у Савет Рэспублікі. Рэгулярна спікер верхняй палаты парламента, а таксама сенатары выязджаюць у рэгіёны, пакідаюць свае рабочыя кабінеты для таго, каб даведацца аб клопатах і праблемах насельніцтва.**
**Мала якія пытанні людзей, з якімі яны звяртаюцца да парламентарыяў падчас прыёмаў грамадзян, застаюцца нявырашанымі. Па-за ўвагай членаў Савета Рэспублікі, асабліва яго старшыні, не застанецца ніводная просьба або праблема.**



У гэтым нядаўна пераканаўся **жыхар пасёлка Чонкі Гомельскага раёна Кірыл Блінкоў**. На працягу васьмі гадоў мужчына звяртаўся ў розныя інстанцыі з просьбай заасфальтаваць дарожнае пакрыццё на вуліцы Сонечнай у Чонках. Усюды адмаўлялі — то грошай няма, то яшчэ нейкія прычыны знаходзіліся. У некаторых дзяржаўных органах грамадзяніну абяцалі дапамагчы і ўключылі пытанне ў план па ўладкаванні дарожнага пакрыцця, у якім рэканструкцыя дарогі ў Чонках стаяла амаль пад двухсотым нумарам так званай чаргі.

«Дарога была настолькі дрэнная, што ні на машыне, ні на калясцы рухацца было амаль немагчыма, — расказвае Кірыл Аляксандравіч. — Пасля дажджоў увогуле можна было ўваліцца ў яму».

Рамонт пачалі толькі пасля таго, як пытанне на кантроль узяла Старшыня Савета Рэспублікі. У выніку ў верасні 2022 года ўчастак дарогі ў аграгарадку, які патрабаваў асфальтабетоннага пакрыцця, быў прыведзены ў належны стан.

**Мінчанка Людміла Мачульская**, якая ў свой час набыла жылыя метры ў Мінскай вобласці, сутыкнулася з праблемай, што тэхнічны пашпарт на кватэру не адпавядаў рэчаіснасці. Жыллё знаходзіцца ў доме на шэсць кватэр. Да кожнай адносіцца невялікі ўчастак зямлі ў паўтары «соткі». Для таго каб узаконіць тэхнічны пашпарт, трэба было прыватызаваць зямлю. Аднак гэта аказалася не так проста. Жанчыне растлумачылі, што вырашыць пытанне можна толькі ў тым выпадку, калі прыватызуюць свае ўчасткі і ўладальнікі астатніх кватэр. Пры гэтым гаспадарам неабходна было заплаціць немалыя грошы — каля 500 рублёў.

Людміла Мачульская не магла вырашыць сваё пытанне з восені 2021 года. Куды яна толькі ні звярталася, усюды — або адмова, або непаразуменне. Калі мінчанка даведалася, што старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец арганізоўвае прыём грамадзян, то патэлефанавала і запісалася.

— Таццяна Аркадзьеўна вельмі ўважліва мяне выслухала, размаўляла мы доўга, яна ўнікала ва ўсе дэталі гэтага складанага пытання, — расказвае Людміла Іосіфаўна. — Я ўдзячная сенатару за яе чулае і ўважлівае стаўленне да маёй праблемы і садзейнічанне ў яе вырашэнні. Хочацца выказаць вялікую падзяку і Наталлі Іванаўне Качанавай, бо менавіта яна стала адным з пачынальнікаў такой формы зносін з грамадзянамі, як асабісты прыём і прамая лінія. Сенатары дапамагаюць вырашаць усе пытанні, прымушаюць органы ўлады на месцах працаваць, а не займацца адпіскамі.

Мінчанка заўважае, што на працягу таго перыяду, калі вырашалася яе пытанне, супрацоўнікі сакратарыята Савета Рэспублікі пастаянна ёй тэлефанавалі і ўдакладнялі, ці ёсць нейкія перашкоды, затрымкі, на якім этапе знаходзіцца вырашэнне праблемы. У выніку 4 студзеня эпапея з кватэрай для Людмілы Мачульскай была скончана. «Адпаведнай пастановай Мінскага райвыканкама была ўзаконена ўжо не прыватызацыя, а здача ў арэнду гэтай зямлі да 10 снежня 2035 года, — гаворыць Людміла Іосіфаўна. — І, дарэчы, такія паслугі абышліся не ў 454 рублі, а па 40 рублёў з кожнага з уладальнікаў шасці кватэр».

На працягу некалькіх гадоў **Тамара Кулікова** звярталася ў розныя інстанцыі, пачынаючы ад мясцовага да абласнога ўзроўню, нарэшце спальванне смецця **ў аграгарадку Крынкі Лёзненскага раёна**, дзе яна жыве. «У аграгарадку ёсць кантэйнеры, смецце рэгулярна вывозіцца, — тлумачыць жанчына. — Аднак чамусьці людзі прызвычаіліся спальваць усё, што ім хочацца: і адходы сайдынгу, і розны пластык.


Фота БелТА.

На прыёмы да сенатараў прыходзяць людзі рознага ўзросту і сацыяльнага статусу. Гэтыя фота зроблены падчас прыёму, які Наталля Качанава праводзіла ў Віцебску.

Мы дыхаем гэтым: і дзеці, і я, інвалід другой групы. У мяне алергія, аднойчы як надыхалася той хіміяй, давялося нават хуткую дапамогу выклікаць».

Зварот у сельскі Савет карысці не прынёс — грамадзянцы растлумачылі, што нічога страшнага ў тым, калі нехта штосьці спаліць, няма. З просьбай дапамагчы разабрацца ў экалагічным пытанні Тамара Усеваладаўна звярталася і ў раённыя службы, нават выйшла на вобласць — усюды без выніку. Жанчына вымушана была запісацца на прыём грамадзян да Наталлі Качанавай, які спікер праводзіла ў маі ў Віцебскім аблвыканкаме.

«Адразу трапіць на прыём не ўдалося: мне патэлефанавалі і сказалі, што ахвотных запісаца больш як сотня чалавек, і паабяцалі звязаць мяне са Старшынёй Савета Рэспублікі па тэлефоне, — расказвае Тамара Кулікова. — Праз некаторы час мне патэлефанавалі з сакратарыята і папярэдзілі, каб у пэўны час я знаходзілася дома: Наталля Іванаўна сама са мной звяжацца. Так і атрымалася. Яна мяне ўважліва выслухала і паабяцала дапамагчы».

Сітуацыя ў аграгарадку сапраўды наладзілася. Мясцовыя ўлады правялі з насельніцтвам прафілактычную работу, і людзі пачалі збіраць смецце ў прызначаныя для гэтага кантэйнеры. «Я вельмі ўдзячная Наталлі Іванаўне, што маё пытанне імгненна вырашылася — літаральна на працягу тыдня, — адзначае заяўніца. — Больш за тое, прыемна, што праз некаторы час мне патэлефанавалі з Савета Рэспублікі і ўдакладнілі, ці ўсё ў парадку. Атрымліваецца, вышэйстаячая ўлада мяне пачула, а мясцовая або не захацела чуць, або была іншая прычына».

Жанчына ўпэўненая, што такое рашэнне будзе толькі на карысць здароўю жыхароў аграгарадка. «Не толькі ж мне гэта было патрэбна, — пераканаая яна. — І дзеці, і дарослыя — усе дыхаюць паветрам. Лепш, калі яно будзе чыстым».

Гэта толькі некалькі прыкладаў таго, як парламентарыі дапамагаюць людзям справіцца з іх клопатам, вырашыць пытанне, якое турбавала людзей не адзін год. За 2022 год да членаў Савета Рэспублікі паступіла звыш 7 тысяч зваротаў. Па кожным з іх былі прыняты адпаведныя рашэнні.

**Вераніка КАНЮТА.**

**Анатоль СІЛЬЧАНКА:**

# «ІМКНЁМСЯ ПАЧУЦЬ КОЖНАГА ЖЫХАРА»



**Важную ролю ў развіцці рэгіёнаў іграюць ініцыятыўныя і актыўныя людзі на месцах: старэйшыны, грамадзяне, якія актыўна працуюць з насельніцтвам, дапамагаюць у вырашэнні праблем і клапоцяцца аб сваёй малой радзіме. «Звязда» сустрэлася са старшынёй Аршанскага раённага Савета дэпутатаў Анатолем СІЛЬЧАНКАМ, каб даведацца, як праводзіцца работа на месцах.**

***— Анатоль Міхайлавіч, распавядзіце, якія метады дэпутаты Аршанскага раёна практыкуюць у рабоце з грамадзянамі, акрамя традыцыйных прыёмаў і прамых ліній?***

— Мы ўвесь час імкнёмся ўдасканаліць нашу работу: шукаем новыя формы. Удзельнічаем у канферэнцыях, круглых сталах, узаемадзейнічаем з насельніцтвам у сацыяльных сетках і стараемся аператыўна вырашыць актуальныя пытанні. Таксама прымаем удзел у Днях работы з насельніцтвам, галоўнай мэтай якіх з'яўляюцца прамыя зносіны з насельніцтвам: знаёмімся з праблемай і шукаем шлях для яе вырашэння.

***— З якімі пытаннямі звяртаюцца аршанцы падчас асабістых прыёмаў?***

— Гэта ЖКГ, водаканал, юрыдычныя пытанні. Падчас асабістага прыёму мы адразу даём параду, куды трэба звярнуцца, калі справа патрабуе разгляду ў пэўнай інстанцыі: гэта і праваахоўныя органы, і суд, і натарыус. Нягледзячы на тое што ў нас вызначаны спецыяльны дзень для прыёму, сустракаемся з насельніцтвам заўсёды, калі ёсць час. Некаторыя пакідаюць нам свае тэлефоны, і мы перазвоньваем, калі разбяромся з праблемай. Вядома, ёсць пытанні, якія можна вырашыць толькі ў судовым парадку, часцей за ўсё гэта звязана з зямельнымі спрэчкамі. Літаральна на мінулым тыдні да мяне звярнулася жанчына, якая набыла дом, але афіцыйна яго не афарміла — заплаціла грошы, але дакументаў не мае. Хочаш дапамагчы чалавеку, але ў дадзеным выпадку гэта можна вырашыць толькі праз суд.

Калі гаварыць пра колькасць зваротаў, нельга сказаць адназначна, што іх стала менш. Але гэта не самамэта. Наадварот, калі людзі ідуць да ўлады, значыць, яны ёй давяраюць. Перыядычна я выязджаю ў нашы сельсаветы, некаторыя з пытанняў мы ўжо вырашылі, частка — на кантролі.

***— Наколькі вяскоўцы актыўныя ў грамадскім жыцці?***

— Аршанскі раён адрозніваецца вялікай колькасцю сельскіх населеных пунктаў, таму дапамога іх жыхарам — на асаблівым кантролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Гэта зона адказнасці Саветаў дэпутатаў. Добрая падмога ў рабоце з насельніцтвам — старасты. Яны кантралююць добраўпарадкаванне населеных пунктаў і дваровых тэрыторый, сочаць за работай аўтакрам, нарыхтоўкай дроў, станам вулічнага асвятлення, вырашаюць пытанні пажарнай бяспекі, закупак малака, забеспячэння насельніцтва пітной вадой.

Асабліва хацеў бы вылучыць старасту з Крапівенскага сельсавета Тамару Жудро, якая заўсёды актыўна і з энтузіязмам выконвае свае абавязкі. Сярод старастаў Усценскага сельсавета найбольш добрасумленны Міхаіл Багдановіч. Гэта людзі, якія карыстаюцца вялікім аўтарытэтам у землякоў.

***— Наколькі шмат ініцыятыўных грамадзян сярод гарадскога насельніцтва Оршы?***

— Мне здаецца, у кожным населеным пункце такія людзі ёсць. Частка з іх гатова падтрымаць уласную ініцыятыву фінансава, некаторыя проста прапануюць ідэі. Але кожная ініцыятыва павінна быць разумнай і ў першую чаргу накіроўвацца на дабрабыт рэгіёна і краіны. Калі мы займаемся добраўпарадкаваннем, абавязкова раімся з мясцовымі жыхарамі: што яны хацелі б убачыць. Таксама існуе практыка самаабкладання, падчас якой людзі збіраюць грошы і пасля вырашаюць, на што іх выдаткаваць: гэта могуць быць і сцэнды, і гульнявая пляцоўка, і догляд помнікаў.

Да нас звярнуўся аршанец, які жыве на вуліцы Асіпенкі: ён турбаваўся станам дарогі. Мы выехалі на месца, азнаёміліся з праблемай і зрабілі новую дарогу. Пасля грамадзянін прыходзіў да мяне і перадаваў падзяку ад усёй вуліцы. Таксама атрымалі просьбу ад жыхароў Бабініч, якія прасілі праверсці святло на вуліцы: калі аграгарадок будаваўся, на пэўным адрэзку яно было парушана. На сёння асвятленне на вуліцы аднаўлена.

Звычайна мы выязджаем камісіяй, каб адначасова ўсе супрацоўнікі камунальных службаў азнаёміліся з праблемай і вырашылі яе як мага хутчэй. Імкнёмся пачуць кожнага жыхара.

**Арына КАРПОВІЧ. Фота Сяргея СЛЯПЦОВА.**

# «Акцыя, аб'яўленая сёлета, праходзіць у нас даўно»

## Карэспандэнт «МС» пацікавілася ў кіраўнікоў мясцовай улады, як у іх арганізавана наведванне састарэлых адзінокіх людзей, насельнікаў сацыяльных устаноў у рамках акцыі «Ад усёй душы»

**Анатоль СТРУК, старшыня Дамачаўскага сельскага Савета Брэсцкага раёна:**

— На нашай тэрыторыі знаходзіцца Дамачаўскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў, разлічаны на 215 ложка-месцаў. Гэта даволі вялікая ўстанова, якую не абыходзяць увагай мясцовая ўлада, грамадскасць; прадпрыемствы і арганізацыі традыцыйна аказваюць установе шэфскую дапамогу. Вось і на гэтым тыдні ў інтэрнаце адбылося вялікае дабрачыннае мерапрыемства з удзелам Беларускага дзяржаўнага канцэрна па вытворчасці і рэалізацыі тавараў лёгкай прамысловасці, прадпрыемства «Дываны Брэста», УП «Брэстаблгаз», а таксама прадпрыемстваў Брэсцкага раёна.





Для насельнікаў зладзілі канцэрт у Доме культуры, які знаходзіцца цераз дарогу. Некаторых завезлі туды на інвалідных калясках, большасць прыйшла самастойна. Мерапрыемства атрымалася цёплым і змястоўным, людзі выказвалі падзяку за свята.

— Госці прыйшлі з падарункамі, — дапаўняе дырэктар дома-інтэрната Анатоль Ясінскі. — Нам падарылі мікрахвалеўку, тавары санітарна-гігіенічнага і бытавога прызначэння, харчовыя і салодкія наборы. Напрыклад, аграсад «Світанак» падарыў прафесійную газонакасілку з улікам чатырох гектараў нашага ўчастка, а таксама яблыкі для сталоўкі. Падарункаў было шмат, і ўсе вельмі патрэбныя, госці загадзя ўдакладнялі нашы запыты і патрэбы.

Хачу сказаць, што акцыя «Ад усёй душы», аб'яўленая у нашай краіне афіцыйна, у нас праходзіць даўно. У дома-інтэрната склалася кола пастаянных шэфскіх арганізацый, якія перад святамі прыязджаюць з падарункамі, канцэртамі, і мы ім надзвычай удзячныя. Яшчэ больш кранальнымі выглядаюць факты прыватнай ініцыятывы. Напрыклад, ужо некалькі гадоў запар установе аказвае дапамогу сям'я Сцепанюкоў, мясцовых фермераў. Некалі дабрачынную справу пачынаў галава сям'і, а пасля яго смерці прадоўжылі жонка і сын. Прадпрымальнікі з Брэста аказваюць паслугі ў галіне фізкультуры і спорту, яны сталі нашымі пастаяннымі фундатарамі. Муж і жонка спецыяльна ладзяць трэніроўкі з наведвальнікамі, а ў якасці аплаты просяць кліентаў прыносіць патрэбныя для нашай установы тавары. Нярэдка прывозілі памперсы, іншыя прадметы гігіены, часам на вельмі немалыя сумы.





Акцыя ў Дамачаўскім доме-інтэрнаце.



Нас падтрымліваюць рэлігійныя арганізацыі. Моладзь з брэсцкай абшчыны евангельскіх хрысціян-баптыстаў прыязджала ў мінулую суботу са спектаклем, яны прывезлі таксама салодкія падарункі. А летась каталіцкая місія з Пінска падарыла дзве пральныя машыны, прасы, апараты для вымярэння ціску. Школьнікі Дамачаўскай школы не забываюць установу, прыходзяць да нас з канцэртамі, гэта вельмі прыемна, — падсумаваў Анатоль Ясінскі.

Старшыня Дамачаўскага сельвыканкама Анатоль Струк дадаў, што падобныя акцыі патрэбны не толькі пажылым, хворым людзям, але і маладому пакаленню, якое атрымлівае ўрокі дабрыні, міласэрнасці, спагады.

**Святлана ДЫШКА, старшыня Папінскага сельскага Савета Драгічынскага раёна:**

— Мы заўсёды памятаем сваіх сталых жыхароў, асабліва тых, хто пражывае асобна альбо зусім адзінокі. Не забываем і заслужаных ветэранаў працы. Напрыклад, перад Калядамі, 6 студзеня, прыгожа ўшанавалі Ганну Мікалаеўну Стадніцкую, жыхарку вёскі Новая Папіна, якая днямі адзначыла 80-годдзе. Ганна Мікалаеўна ў свой час была перадавой даяркай і цялятніцай, мае бронзавы медаль ВДНГ СССР за працоўныя заслугі. Павіншаваць яе з юбілеем і Калядамі, акрамя прадстаўнікоў мясцовай улады, прыехалі кіраўнік ААТ «Пенякова» Аляксандр Шульжык, старшыня прафкама гаспадаркі. Атрымалася цёплая гутарка, ветэран падзялілася ўспамінамі пра работу ў гаспадарцы.

На наступным тыдні плануем мерапрыемствы ў Зарэччы, Ляхавічах з віншаваннямі і наведваннем пажылых людзей.

**Вера ПІКУЛА, старшыня Дзівінскага сельскага Савета Кобрынскага раёна:**

— У гэтай высакароднай акцыі максімальна стараемся задзейнічаць школьнікаў. У нас на тэрыторыі працуюць тры сярэднія школы. Вучні наведваюць пажылых людзей, даюць невялікія канцэрты, аказваюць пасільную шэфскую дапамогу. Такім чынам імкнёмся зладзіць дыялог пакаленняў. Пажылыя людзі дзеляцца ўспамінамі, вучні ж маюць магчымасць даведацца гісторыю свайго краю, пра маладосць пакалення дзядоў ды бабуль і нават прадзедаў. Такія гутаркі, сустрэчы атрымліваюцца плённымі, многія з сталых людзей — дзеці вайны і пасляваенных цяжкіх гадоў. Менавіта яны могуць навучыць сённяшніх юнакоў і дзяўчат цаніць і берагчы мір, навучыць ствараць, а не разбураць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

# ВЫХАВАННЕ ПРАЗ МУЗЕЙ




## Маладзёжная ініцыятыва пашырыла экспазіцыю, прысвечаную Вялікай Айчыннай вайне, да памераў асобнага памяшкання

**Пад матэрыялы на дадзеную тэматыку ў Крычаве аддадзены былы будынак банка па вуліцы Савецкай. Хроніка ваенных падзей на крычаўскай зямлі ўзноўлена тут на плошчы больш чым 70 квадратных метраў. У аснову экспазіцыі пакладзены адзін з глабальных патрыятычных праектаў, якія Крычаў прысвяціў Году гістарычнай памяці.**

### Летапіс вайны

Мы ўжо пісалі пра мабільную выставу «Гераічны летапіс Крычаўшчыны», якая была створана актывістамі тутэйшага маладзёжнага парламента з лёгкай рукі дэпутатаў Крычаўскага райсавета. Яе прэзентацыя адбылася сёлета ў рамках тыдня тэматычных мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня народнага адзінства. Гэты праект стаў адным з 18 найлепшых ініцыятыў краіны і атрымаў фінансаванне. Летапіс ахоплівае ўсе перыяды ваеннага ліхалецця: абарончыя баі ў ліпені 1941 года, час акупацыйнага рэжыму і гераічнае вызваленне Крычаўшчыны. Сярод матэрыялаў — копіі дакументаў з фондаў музея, занальнага архіва і раённай пракуратуры, якая выявіла новыя злачынствы супраць насельніцтва. На сёння гэта самая поўная інфармацыя пра ваенныя падзеі ў Крычаўскім раёне. Выстава пабывала ва ўсіх арганізацыях, прадпрыемствах і ўстановах Крычава, атрымала шмат станоўчых водгукаў. І менавіта яна лягла ў аснову абноўленай экспазіцыі пра вайну.

— Адкрыццё залы Вялікай Айчыннай вайны ў асобным будынку стала падарункам роднаму гораду і пацвярджэннем таго, што наша моладзь з'яўляецца дастойнай пераемніцай і захавальніцай традыцый ды заваяванняў сваіх прадзедаў, — адзначыла **старшыня Крычаўскага райсавета Ірына ПРУДНІКАВА**. — Адметна, што інфармацыя збіралася непасрэдна маладымі людзьмі, яны прапускалі праз сябе ўсе тыя падзеі. Мы са свайго боку дапамагалі там, дзе гэта было неабходна.

Патрэба ў новым памяшканні з'явілася тады, калі стала зразумела, што зала гістарычнага музея Крычава, прысвечаная падзеям Вялікай Айчыннай вайны, не ў стане змясціць такую вялікую колькасць новых экспанатаў. Якраз знайшоўся падыходзячы будынак. Пасадзейнічала тут дэпутат райсавета Ала Змітровіч — дырэктар цэнтральнага аддзялення «Беларусбанка» горада Крычава. Банк пераехаў у новы будынак, а былы вырашана было выкарыстаць для добрай справы. Акрамя тых матэрыялаў, якія былі сабраны падчас падрыхтоўкі праекта, сюды пераехала і частка тых, што захоўваліся ў гістарычным музеі і яго фондах. Усяго ў новай музейнай экспазіцыі задзейнічана каля тысячы экспанатаў.




— Вельмі зручна, што будынак размешчаны ў цэнтры горада, — адзначае **старшыня Маладзёжнага парламента, дырэктар раённага гістарычнага музея Уладзімір МІШЧАНКА**. — Экспазіцыя ўнікальная тым, што ў ёй з'явіліся раней невядомыя факты, звязаныя з генацыдам. Новыя плошчы дазволілі нават узнавіць кавалачак той жахлівай гісторыі перыяду акупацыі. Для гэтага мы выкарысталі былое ўмацаванае банкаўскае сховішча для грашовых сродкаў — невялічкі пакойчык, дзе раней стаялі сейфы. Нават жалезныя дзверы з кратамі спатрэбіліся. Цяпер гэта камера для ваеннапалонных, падобная да той, што была ў крычаўскім лагеры смерці, які знаходзіўся на тэрыторыі цэмзавода. Афармленая адмысловай падсветкай, яна выразна перадае тыя жахлівыя ўмовы, у якіх фашысты трымалі людзей.



Пакуль запоўнена яшчэ не ўся музейная прастора. Ёсць некалькі асобных пакояў, дзе можна рэалізаваць шмат перспектыўных ідэй. Уладзімір Мішчанка кажа, што ў адным з іх можа матэрыялізавацца Крычаў з яго сучаснай гісторыяй. Яшчэ ў адным, напрыклад, размесцяцца этнаграфічныя экспанаты.



### Генератары ідэй

Крычаўскі Маладзёжны парламент — гэта 32 ініцыятыўныя маладыя чалавекі ва ўзросце да 31 года.

— У нашым парламенце ёсць прадстаўнікі ўсіх школ, але касцяк — менавіта працоўная моладзь крычаўскіх прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, — кажа Уладзімір Мішчанка. — Дарэчы, калі мы займаліся зборам матэрыялаў для гераічнага летапісу, пра асобнае памяшканне не было і размовы. Меркавалася, што выстава будзе выключна перасовачная. Але нас чакаў прыемны сюрпрыз. Над праектам працавалі паўгода. Частка музейных работнікаў — яшчэ і члены Маладзёжнага парламента, нам было прасцей звязаць ініцыятыву з музейнай работай. Не трэба было лішні раз адрываць людзей іншых прафесій. Выключэнне складалі толькі тыя, хто цікавіўся мясцовай гісторыяй. Адным словам, справай займаліся людзі, цалкам ёй адданыя. Дарэчы, нядаўна ў Палацы моладзі ў Мінску былі падведзены вынікі першага сезона гэтага конкурсу, і мы падрабязна расказалі пра свой праект. Мы вельмі ганарымся, што сталі аднымі з 18 пераможцаў конкурсу. Гэта вельмі прэстыжна. Заявак жа на яго было пададзена аж 493!

Наогул, напрамкі работы Маладзёжнага парламента самыя розныя. Гэта і добраўпарадкаванне, і экалагічныя мерапрыемствы накшталт Тыдня лесу. Маладыя хлопцы і дзяўчаты — актыўныя ўдзельнікі ў жыцці горада. З апошняга, што ім прыйшлося рабіць, — ачышчаць Крычаў ад снежных завалаў. Яны аднымі з першых выйшлі на барацьбу з наступствамі стыхіі і цалкам пачысцілі прыпынак грамадскага транспарту каля бальніцы.

### Горад для моладзі

Ірына Пруднікава звяртае ўвагу на тое, што ні адно дэпутацкае мерапрыемства ці пасяджэнне райсавета не абыходзіцца без удзелу Маладзёжнага парламента. Нядаўна, напрыклад, разам распрацоўвалі канцэпцыю ўстойлівага развіцця райцэнтра да 2035 года. Такая сумесная работа з моладдзю толькі на карысць гораду. Суразмоўца ўспамінае два найбольш знакавыя праекты, якія атрымалася ажыццявіць у 2022-м. Адзін з іх — дзіцячая пляцоўка, якая была створана да Дня Незалежнасці. У гэтай лакацыі знаходзіцца некалькі тэматычных алей, якія дапамагаюць папоўніць веды пра выбітных жыхароў горада, ёсць спартыўная і канцэртная пляцоўкі, дзе выступаюць школьнікі.

Папулярнасцю карыстаецца і экагарадок, які размешчаны непадалёк ад Маладзёжнага возера. Зроблены ён па ініцыятыве старшыні Крычаўскага райвыканкама Андрэя Седукова. Тут уздоўж возера ўстаноўлена шэсць альтанак — падарунак ад шасці лясніцтваў, якія працавалі на ліквідацыі наступстваў майскага ўрагану. Упрыгожвае экагарадок навагодняя ёлка. Каля яе гэтымі святочнымі днямі шмат цікавых прадстаўленняў.

### Сродкі для ідэй

Вядома, любыя праекты патрабуюць грошай, прычым немалых. Актыўнае насельніцтва, якое дапамагае, — гэта цудоўна, але ў Крычаве знайшлі дадатковы спосаб прыцягнення фінансаў. Дэпутаты параіліся між сабой і вырашылі, што папаўняць дэпутацкую скарбонку можна сродкамі ад суботнікаў. З 34 дэпутатаў райсавета — 19 кіраўнікоў лінейных арганізацый горада. Сказана — зроблена. Прынялі адпаведнае рашэнне і цяпер не ламаюць галаву, дзе знайсці лішнюю капейку на той ці іншы праект. Гораду ж двайная карысць. Па-першае, у ім становіцца чысцей і прыгажэй. Па-другое, ёсць сродкі на рэалізацыю важных народных праектаў. Дарэчы, добраўпарадкаванне дзіцячай пляцоўкі ў скверы 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі якраз за гэтыя сродкі і рэалізавана. Ініцыятыва ўвасобілася ў рамках абласнога праекта «Спадчыннікам Вялікай Перамогі!», прысвечанага Году гістарычнай памяці. Таксама быў добраўпарадкаваны гістарычны сквер, які знаходзіцца побач з будынкам, куды пераехала зала Вялікай Айчыннай вайны. Там ёсць і іншыя напаміны пра знакавыя моманты гісторыі горада. У Крычава яна наогул вельмі цікавая. У XVIII стагоддзі тут была нават суднаверф для расійскага флоту. Дэпутаты гэты гістарычны момант аформілі ў малых архітэктурных формах. На перакрыжаванні вуліц Савецкай і Ленінскай з'явілася цэлая кампазіцыя па матывах мінулага ў спалучэнні з сучасным — вежа са шпілем, якая нагадвае пра марское мінулае Крычава, фантан і лавачка прымірэння. Месца стала сапраўднай разыначкай горада.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота Таццяны ПАДЛІПСКАЙ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 12.768. Нумар падпісаны ў 19.30 10 студзеня 2023 года.

БЕЛАРУСБАНК

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | **Лот № 1. Изолированное помещение № 130/D-60923 (Гараж № 3).**<br>**Лот № 2. Изолированное помещение № 130/D-60924 (Гараж № 4).**<br>**Лот № 3. Изолированное помещение № 130/D-60925 (Гараж № 5)** |
| **Месторасположение объекта** | Лот № 1 – г. Пинск, ул. Иркутско-Пинской Дивизии, 35А/1-1.<br>Лот № 2 – г. Пинск, ул. Иркутско-Пинской Дивизии, 35А/1-2.<br>Лот № 3 – г. Пинск, ул. Иркутско-Пинской Дивизии, 35А/1-3 |
| **Продавец объекта** | ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Организатор торгов** | Брестское областное управление № 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» |
| **Площадь** | Лот № 1 – 19,2 кв. м<br>Лот № 2 – 19,4 кв. м<br>Лот № 3 – 19,4 кв. м |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС** | Лот № 1 – 5664,00 руб.<br>Лот № 2 – 5760,00 руб.<br>Лот № 3 – 5760,00 руб. |
| **Сумма задатка** | Лот № 1 – 566,00 руб.<br>Лот № 2 – 576,00 руб.<br>Лот № 3 – 576,00 руб. |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым № 144500000015001268, с площадью 0,0174 га |
